

**Праблема, якая хвалюе многія сем'і: што рабіць з хворымі старымі? Ім патрэбна штодзённая дапамога, а сваякі... Не, яны зусім не чэрствыя, проста ў іх свае сем'і, свае дзеці, праца, якая адымае шмат часу і сіл...** СТАР. 2



**Фільм «Роля» расійскага рэжысёра Канстанціна Лапушанскага, створанага пры ўдзеле «Беларусьфільма», адабраны ў асноўны конкурс 35-га Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю.** СТАР. 3



**Калі вы адпраўляеце 7-гадовае дзіця ўпершыню ў лагер, выбірайце летнік, размешчаны недалёка ад дома. У другі або трэці раз ужо можна падумаць пра далёкія паездкі, магчыма і на мора.** СТАР. 5

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 чэрвеня 2013 г. СУБОТА № 104 (27469) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ПРОЦІСТАЯЦЬ ПАГРОЗАМ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ БЯСПЕЦЫ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ўручыў Сцяг Аператыўна-аналітычнаму цэнтру пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь як сімвал гонару, доблесці і славы, напамін кожнаму супрацоўніку аб свяшчэнным абавязку абароны Айчыны, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

«Уручэнне Аператыўна-аналітычнаму цэнтру Сцяга з'яўляецца пацвярджэннем яго высокага статусу як дзяржаўнага органа сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі. За пяць гадоў свайго існавання цэнтр прайшоў вялікі шлях развіцця, нязменна дэманструючы высокі прафесійны ўзровень у вырашэнні пастаўленых задач. Яго супрацоўнікі — мужныя і сумленныя людзі, аддадзеныя сваёй справе, якім можна давяраць заўсёды і ва ўсім», — гаворыцца ў запісе Прэзідэнта, зробленым у гістарычным фармуляры ААЦ.

«Вы не маеце права на памылку. Гэта павінен быць самы сумленны, чысты і справядлівы орган нашай краіны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да супрацоўнікаў цэнтра.

«Многія нашы грамадзяне ўспрымаюць Аператыўна-аналітычны цэнтр як апошнюю інстанцыю ў пошуках праўды, звязваюць з ім надзеі на вырашэнне важнейшых для сябе пытанняў і праблем. Для мяне гэта з'яўляецца адным з галоўных і пераканаўчых сведчанняў эфектыўнасці вашай работы, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Сёння цэнтр заняў сваё месца ў сістэме дзяржаўных органаў Беларусі. Ён паспяхова выконвае спецыфічныя задачы і функцыі, звязаныя з правядзеннем аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, дзяржаўным рэгуляваннем у сферы тэхнічнай абароны інфармацыі і інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій».

«Маючы высокі аўтарытэт і прэзідэнцкую падтрымку, Аператыўна-аналітычны цэнтр абавязаны актывізаваць работу па ўсіх напрамках сваёй дзейнасці», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у многім дзякуючы рабоце спецыялістаў ААЦ Беларусь у апошнія гады ўзнялася ўверх у сусветных рэйтынгах развіцця інфармацыйнага грамадства. «Вамі паспяхова рэалізуецца буйны інвестыцыйны праект, адным з вынікаў якога стала будаўніцтва высакахуткаснай транзітнай магістралі паміж Масквой і Франкфуртам», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Гэты праект і ўсе астатнія вы ініцыіравалі самі. Вы пакуль, дай бог каб заўсёды, працуеце так, як я патрабую. У вас дзяржаўны падыход да справы. Але вы ні ў якім выпадку не павінны спыняцца на дасягнутым. Калі вы спыніцеся, вас абыдуць. Таму вам трэба заўсёды вельмі хутка бегчы, апярэджваючы гігантаў дзяржавы, якія маюць больш магчымасцяў для развіцця тых напрамкаў, якія знаходзяцца ў вашай адказнасці», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Акрамя таго, вы павінны быць гатовы процістаяць пагрозам інфармацыйнай бяспецы. У нядаўнім мінулым Цэнтр сумесна з іншымі структурамі змог спыніць спробы разгойдвання палітычнай сітуацыі з дапамогай сеткі інтэрнэт. Упэўнены, што вы і ў далейшым будзеце даваць дастойны адказ на такія правакацыі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Наша задача, і перш за ўсё ваша, сумесна з іншымі сілавымі структурамі абараніць нашу дзяржаву і наш народ», — дадаў беларускі лідар.

# ВЯСЁЛЫ ЦЯГНІЧОК У ХОЙНІКАХ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксандр ЖУК, першы намеснік міністра адукацыі:**

***«У 2011 годзе на работу ў трэцім працоўным семестры выязджала больш за 900 атрадаў, а ў 2012-м іх было ўжо больш за 2 тысячы. Асабліва прыемна, што з гэтага года мы адраджаем сумесныя беларуска-расійскія атрады. Студэнцкія атрады сёлета паўдзельнічаюць у працоўных акцыях у будаўнічай, экалагічнай, сэрвіснай, сельскагаспадарчай і педагагічнай сферах. Хацеў бы пры гэтым адзначыць важнасць захавання і развіцця моладзевай рабочай ініцыятывы. Студатрадаўскі вопыт нічым нельга замяніць. Менавіта ў нефармальнай атмасферы выяўляюцца найлепшыя чалавечыя якасці».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.06.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8690,00 | ▼ |
| Еўра | 11510,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 269,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1067,90 | ▲ |

■ «Маладзечна-2013»

# СІМВАЛ ШЧАСЦЯ

**Спявалі. Падпявалі. Гудзелі... Не паспелі адкрыць Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі, як ужо апошні дзень: фінальны канцэрт, акорд, феерверк. Вось жа яно, свята для людзей. Тое, што прапануецца ім на радасць. Каб далей жыць з упэўненасцю, якая падчас падобных мерапрыемстваў агортвае сама сабой, падступае комам да горла, калі чуеш развагі асобных людзей пра тое, што ўсё гэта зроблена дзеля мяне, дзеля нас, дзеля народа. Бо народ наш заслужыў. Ён — працаўнік. А хто працуе — той і адпачывае. Святое права...**

Яно сёлета дадзена маладзечанцам яшчэ і за тое, што яны жывуць у Мінскай вобласці, якая адзначае сваё 75-годдзе, у тым ліку заключным канцэртам фестывалю «Ты ў шчасці жыві, мая Беларусь!» у суботу вечарам. Вядома, нельга без феерверку — для поўнага шчасця. СТАР. 3



Фота БЕЛТА.

■ Смаката

# КЛУБНІЦЫ ПАЙШЛІ Ў МАСЫ!

**Лунінецкае раённае спажывецкае таварыства днямі ўстанавіла закупачныя цэны на клубніцы, якія будуць нарыхтоўваць ад насельніцтва.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Салодкую ягаду, якая пойдзе на прамперапрацоўку на віно, будзем прымаць па 2 тысячы рублёў. Закупачная цана на клубніцы для кансервавання — 3 тысячы рублёў за кілаграм, — распавяла журналісту «Звязды» эканаміст спажывецкага таварыства Аксана Сайко. — Так званую таварную ягаду прадаюць па 13-14 тысяч рублёў. Гэта я вам называю кошт на момант нашай размовы, бо на цану ўплывае шэраг фактараў і яна ўвесь час мяняецца. Напрыклад, учарашні дзень быў сонечным, і таму было надзвычай шмат і пакупнікоў і прадаўцоў. У выніку цана на названую таварную ягаду знізілася да 5 тысяч рублёў за кілаграм. А ўвечары пайшоў дождж, ноччу была навальніца...

Пакуль віды на сёлетні ўраджай у «клубнічным краі» выдатныя, але, як вядома, усё залежыць ад надвор'я. Ужо колькі разоў так было, што яно ўносіла істотныя карэктывы ў першапачатковыя планы. На жаль, не быў выключэннем у гэтым плане і мінулы год, калі ўмовы надвор'я, што склаліся ў разгар сезона, фактычна датэрмінова яго згарнулі. Тым не менш летась было нарыхтавана 705,2 тысячы тон клубніц. На сёлетні сезон заданне па нарыхтоўках салодкай ягады ад насельніцтва складае 710 тон. Пакуль, праўда, у «засеках» нічога няма. Па-першае, пра закупачныя цэны стала вядома толькі-толькі, па-другое, першую таварную ягаду насельніцтва імкнецца рэалізаваць самастойна, найперш праз рынкі (ды і ў раёне ўжо пачалі нарыхтоўку спажывецкія раённыя таварыствы з іншых куткоў краіны).

— Тыя клубніцы, што я і многія іншыя пакаштавалі з уласных агародаў, — добрыя, салодкія, — падзялілася ўласнымі ўражаннямі ад смаку Аксана Пятроўна. — А нехта кажа, што ягада вады нацягнула. Таму застаецца дадаць заўсёднае: усё залежыць ад надвор'я.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# ДАДАТКОВЫЯ МЕРЫ ПА АДКАЗНАСЦІ ЗАБУДОЎШЧЫКАЎ І АБАРОНЕ ПРАВОЎ ГРАМАДЗЯН ПРЫ ДОЛЕВЫМ БУДАЎНІЦТВЕ

**Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта, Аляксандр Лукашэнка падпісаў 6 чэрвеня ўказ № 263 «Аб долевым будаўніцтве аб'ектаў у Рэспубліцы Беларусь».**

Дакумент устанаўлівае агульныя асноўныя прынцыпы долевага будаўніцтва шматкватэрных, аднакватэрных і блакіраваных жылых дамоў для розных катэгорый грамадзян, а таксама зацвярджае Палажэнне аб долевым будаўніцтве аб'ектаў у Беларусі, форму тыпавога дагавора стварэння аб'екта долевага будаўніцтва жылых памяшканняў з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі і (або) з абмежаваным прыбыткам забудоўшчыка.

Нараўне з дзеючымі ў сферы долевага будаўніцтва нормамі заканадаўства ўказам прадугледжаны наступныя дадатковыя меры па абароне правоў дольшчыкаў і адказнасці забудоўшчыкаў.

Так, з ліку магчымых забудоўшчыкаў выключаны індывідуальныя прадпрымальнікі.

Мясцовым выканаўчым і распарадчым органам будзе выдавацца грамадзяніну накіраванне на долевае будаўніцтва жылога памяшкання з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі і (або) з абмежаваным прыбыткам забудоўшчыка толькі з улікам даты пастаноўкі гэтага грамадзяніна на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Для грамадзян, якія будуюць жылыя памяшканні з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі і (або) з абмежаваным прыбыткам забудоўшчыка, дагавор заключаецца толькі па зацверджанай тыпавой форме. Акрамя таго, устаноўлена забарона на заключэнне дагавораў з улікам прывязкі цаны аб'екта долевага будаўніцтва да валютнага эквіваленту (для грамадзян, якія не знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, такая норма не прадугледжана). СТАР. 2

# УВАГА! МОЦНЫЯ ЛІЎНІ, НАВАЛЬНІЦЫ І НАВАТ ГРАД

**У гэтыя выхадныя паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя дажджы з навальніцамі, а ў асобных раёнах — моцныя ліўні і град.**

Сёння пры навальніцах шквалістае ўзмацненне ветру да 15—20 м/с. Тэмпература паветра 22—28 градусаў; у нядзелю ўначы — 11—17, удзень 20—28.

Даволі складаныя ўмовы надвор'я прагназуюцца і ў панядзелак, калі чакаюцца месцамі моцныя дажджы, навальніцы і град. **На суботу сіноптыкі аб'явілі аранжавы ўзровень небяспекі ў Брэсцкай, Гродзенскай, Віцебскай і Мінскай абласцях.**

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## АЛІЕЎ ВЫЛУЧАНЫ НА ТРЭЦІ ТЭРМІН

Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў вылучаны кандыдатам на пасаду кіраўніка дзяржавы на будучых прэзідэнцкіх выбарах, перадаюць інфармагенцтвы. Вылучэнне прайшло на V з'ездзе кіруючай партыі «Новы Азербайджан», дзе Аліеў быў таксама пераабраны старшынёй партыі ўлады.

## ЛІДАРЫ ЗША І КІТАЯ ЎЛАДЗЯЦЬ РОЗНАГАЛОССІ Ў НЕФАРМАЛЬНАЙ АТМАСФЕРЫ

Новы старшыня КНР Сі Цзіньпін прыбыў у Каліфорнію на нефармальную сустрэчу з прэзідэнтам ЗША Баракам Абамам, піша BBC News. Гэтая сустрэча з'яўляецца першай паміж амерыканскім лідарам і выбраным у сакавіку кіраўніком КНР. Цзіньпін прыбыў у Амерыку з жонкай, выканаўцай кітайскіх народных песень Пэн Ліюань. Чакаецца, што галоўнымі тэмамі перамоў будуць развіццё эканамічнага супрацоўніцтва, сітуацыя на Карэйскім паўвостраве, дзе ЗША разлічваюць на садзейнічанне Пекіна ў ціску на КНДР, і кібершпіянажу з боку Кітая. Хакерскія атакі сталі адным з апошніх скандалаў паміж КНР і ЗША. Пасля таго як стала вядома, што кітайскія хакеры выкралі даныя аб распрацоўках амерыканскай абароннай сістэмы, кіраўнік Пентагона Чак Хейгел абвінаваціў улады КНР у падтрымцы кібершпіянажу. Кітай адхіліў гэтыя абвінавачанні і, у сваю чаргу, заявіў, што валодае вялікай колькасцю інфармацыі аб кібератаках з ЗША.



ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ПУЦІНЫ АБ'ЯВІЛІ ПРА РАЗВОД

**Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін і яго жонка Людміла абвясцілі аб разводзе. Гэта было зроблена публічна ў Дзяржаўным Крамлёўскім палацы, куды яны прыйшлі на балет «Эсмеральда».**

Людміла Пуціна падкрэсліла, што гэта «цывілізаваны развод». Па словах Уладзіміра Пуціна, рашэнне аб разводзе было прынята сумесна. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што яго праца звязана з абсалютнай публічнасцю і ёсць людзі, якія з гэтым «абсалютна несумяшчальныя». Уладзімір Пуцін дадаў, што яго жонка ў якасці першай лэдзі «адстаяла вахту 9 гадоў». Нягледзячы на завяршэнне шлюбу, Людміла Пуціна падкрэсліла, што яны з мужам застануцца блізкімі людзьмі. Развод яна патлумачыла рэдкімі сустрэчамі з мужам. Уладзімір Пуцін ажаніўся з Людмілай Пуцінай у ліпені 1983 года. У шлюбе ў іх нарадзіліся дзве дачкі.

ISSN 1990 - 763X

13104

9 771990 763008

БПС-СБЕРБАНК

**В связи со снижением ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с 25% до 23,5% годовых, ОАО «БПС-Сбербанк» с 10.06.2013 устанавливает по срочным банковским депозитам физических лиц в белорусских рублях следующий размер процентов:**

1. по вновь привлекаемым и автоматически продлеваемым депозитам:

СР НБ РБ с 10.06.2013 – 23,5% годовых

| Наименование депозита/ сумма депозита | Размер процентов (годовых) по срокам привлечения | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 90-189 дней | 190-369 дней | 370-500 дней | 501-750 дней | 751-1000 дней |
| **«Сохраняй»** | | | | | |
| от 500 тыс. – до 5 млн. | 18 (СР-5,5 п.п.) | 20,25 (СР-3,25 п.п.) | 22,25 (СР-1,25 п.п.) | 24,25 (СР+0,75 п.п.) | 26,25 (СР+2,75 п.п.) |
| от 5 млн. – до 25 млн. | 19,5 (СР-4 п.п.) | 21,25 (СР-2,25 п.п.) | 23,5(СР) | 25,5 (СР+2 п.п.) | 27,5 (СР+4 п.п.) |
| от 25 млн. – до 100 млн. | 20,25 (СР-3,25 п.п.) | 22 (СР-1,5 п.п.) | 24 (СР+0,5 п.п.) | 26,25 (СР+2,75 п.п.) | 28,25 (СР+4,75 п.п.) |
| от 100 млн. | 20,5 (СР-3 п.п.) | 22,25 (СР-1,25 п.п.) | 24,5 (СР+1 п.п.) | 26,5 (СР+3 п.п.) | 28,5 (СР+5 п.п.) |
| **«Пополняй»** | | | | | |
| от 500 тыс. – до 5 млн. | 17,75 (СР-5,75 п.п.) | 20 (СР-3,5 п.п.) | 22 (СР-1,5 п.п.) | 24 (СР+0,5 п.п.) | 26 (СР+2,5 п.п.) |
| от 5 млн. – до 25 млн. | 19,25 (СР-4,25 п.п.) | 21 (СР-2,5 п.п.) | 23,25 (СР-0,25 п.п.) | 25,25 (СР+1,75 п.п.) | 27,25 (СР+3,75 п.п.) |
| от 25 млн. – до 50 млн. | 20 (СР-3,5 п.п.) | 21,75 (СР-1,75 п.п.) | 23,75 (СР+0,25 п.п.) | 26 (СР+2,5 п.п.) | 28 (СР+4,5 п.п.) |
| от 50 млн. – до 100 млн. | 20,25 (СР-3,25 п.п.) | 22 (СР-1,5 п.п.) | 24 (СР+0,5 п.п.) | 26,25 (СР+2,75 п.п.) | 28,25 (СР+4,75 п.п.) |
| от 100 млн. | 20,4 (СР-3,1 п.п.) | 22,2 (СР-1,3 п.п.) | 24,4 (СР+0,9 п.п.) | 26,4 (СР+2,9 п.п.) | 28,4 (СР+4,9 п.п.) |

| Наименование депозита / неснижаемый остаток | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **«Управляй»** | | | | | |
| 1,5 млн. | 12,5 (СР-11 п.п.) | 14,5 (СР-9 п.п.) | 16,5 (СР-7 п.п.) | 18,5 (СР-5 п.п.) | 20,5 (СР-3 п.п.) |
| 5 млн. | 13,5 (СР-10 п.п.) | 15,5 (СР-8 п.п.) | 17,5 (СР-6 п.п.) | 19,5 (СР-4 п.п.) | 21,5 (СР-2 п.п.) |
| 25 млн. | 16,5 (СР-7 п.п.) | 19,5 (СР-4 п.п.) | 21,5 (СР-2 п.п.) | 23,5(СР) | 25,5 (СР+2 п.п.) |
| 100 млн. | 17,5 (СР-6 п.п.) | 20,5 (СР-3 п.п.) | 22,5 (СР-1 п.п.) | 24,5 (СР+1 п.п.) | 26,5 (СР+3 п.п.) |
| Депозит и текущий (расчетный) счет с использованием банковской платежной карточки «Пенсионный» – 23,5 (СР) | | | | | |

2. по депозитам, прием которых прекращен

| Наименование депозита | Срок привлечения | Размер процентов (годовых) |
|---|---|---|
| **«Перспективный»** | 18 месяцев | 21 (СР – 2,5 п.п.) |
| **«К совершеннолетию»** | 2 года | 26,5 (СР + 3 п.п.) |
| | 3 года | 27,5 (СР + 4 п.п.) |

По депозитам, привлеченным до 10.06.2013, и депозитам, прием которых прекращен, установленный размер процентов будет применен с 10.07.2013.

**Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк», на сайте банка www.bps-sberbank.by или по телефону 148 в стационарной и мобильных сетях**

Проценты, выплаченные по депозитам в белорусских рублях в течение 2012 г. (млрд. руб.): январь – 25,9; февраль – 27,7; март – 29,6; апрель – 27,1; май – 26,4; июнь – 23,2; июль – 21,6; август – 20,2; сентябрь – 16,6; октябрь – 16,9; ноябрь – 17,9; декабрь – 17,7.

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 10.10.2011 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»*

# ДАДАТКОВЫЯ МЕРЫ ПА АДКАЗНАСЦІ ЗАБУДОЎШЧЫКАЎ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Для грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, ільгота аб абмежаванні памеру прыбытку да 5 працэнтаў ад вызначаемай у бягучых цэнах каштарыснай вартасці аб'екта долевага будаўніцтва будзе распаўсюджвацца толькі на нарміруемую плошчу (з разліку 20 кв.м агульнай плошчы будуемага жылога памяшкання на кожнага члена сям'і дольшчыка, у Мінску — 15 кв.м і для шматдзетных сем'яў — 20 кв.м). Гэта тлумачыцца тым, што на практыцы нярэдкія выпадкі будаўніцтва вялікіх кватэр па льготных цэнах сем'ямі, якія маюць у складзе 1 або 2 чалавекі. Кантроль за парадкам заключэння і выканання дагавораў будзе ажыццяўляцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, якія выдалі дольшчыку дазвольную дакументацыю на долевае будаўніцтва аб'ектаў.

У мэтах выключэння двайнога продажу аднаго і таго ж памяшкання і адпаведнасці заканадаўству заключаемых з дольшчыкамі дагавораў долевага будаўніцтва прадугледжана рэгістрацыя мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі не толькі саміх дагавораў, але і дадатковых пагадненняў да дагавора (у выпадку змянення істотных умоў дагавора).

Указам вызначаны парадак скасавання дагавораў бакамі.

Пры датэрміновым скасаванні дагавора забудоўшчык абавязаны будзе прадаставіць права дабудаваць жылое памяшканне ў першую чаргу члену сям'і дольшчыка, з якім скасоўваецца дагавор.

Змяненне цаны аб'екта долевага будаўніцтва па ініцыятыве забудоўшчыка можа ажыццяўляцца толькі ў выпадку змянення статыстычных індэксаў кошту будаўніча-мантажных работ і (або) унясення змяненняў у заканадаўства аб выплаце ўскосных падаткаў, па ўзгадненні бакоў — пры ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у праектную дакументацыю або па хадайніцтве дольшчыка аб аказанні дадатковых паслуг (адмове ад аказання паслуг).

Дакументам прадугледжваецца абавязак забудоўшчыка па правядзенні штогадовага аўдыту мэтавага выкарыстання сродкаў, што прыцягваюцца ў будаўніцтва, з прадастаўленнем копіі вынікаў такога аўдыту ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, права дольшчыка на азнаямленне з вынікамі гэтага аўдыту.

Тэрмін уводу ў эксплуатацыю прывязаны да нарматыўнага тэрміну будаўніцтва. Забудоўшчык мае права з дазволу мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў прадоўжыць тэрмін уводу жылога дома.

У выпадку наяўнасці віны забудоўшчыка ў невыкананні нарматыўнага тэрміну будаўніцтва да забудоўшчыка пасля завяршэння будаўніцтва будуць прыменены штрафныя санкцыі (выплата няўстойкі (пені) дольшчыкам), а пры разліку цаны забудоўшчык будзе абавязаны прымяняць да аб'ёмаў звышнарматыўнага будаўніцтва статыстычныя індэксы кошту будаўніча-мантажных работ, устаноўленыя для месяца, які з'яўляецца апошнім пры нарматыўным тэрміне будаўніцтва.

Акрамя таго, у дагаворы можа прадугледжвацца таксама і адказнасць дольшчыка за несвоечасовае выкананне абавязацельстваў.

У выпадку парушэння ўстаноўленага дагаворам тэрміну ўнясення плацяжоў дольшчык выплачвае забудоўшчыку няўстойку (пеню) у памеры 0,02 працэнта (калі плацяжы ўносяцца дольшчыкам у адпаведнасці з графікам плацяжоў) або 0,002 працэнта (калі плацяжы ўнесены дольшчыкам аднаразова) ад сумы пратэрмінаванага плацяжу за кожны дзень пратэрміноўкі да дня пагашэння запазычанасці або прыняцця рашэння аб скасаванні дагавора ва ўстаноўленым парадку. Дольшчык не нясе адказнасці за несвоечасовае пералічэнне банкам плацяжоў, якія складаюць дзяржаўную падтрымку.

Велічыня прыбытку забудоўшчыка, якая разлічваецца пры заключэнні дагавораў, не можа змяняцца ў сувязі з ростам цаны будуемага аб'екта, за выключэннем яе росту ў адпаведнасці з умовамі, прадугледжанымі ва ўказе. Забудоўшчык пры заключэнні дагавораў будаўнічага падраду прымае рашэнне аб перадачы часткі свайго прыбытку падрадчыку пасля заканчэння будаўніцтва. Памер перадаваемых сродкаў і іншыя ўмовы вызначаюцца ў дагаворы паміж бакамі. Гарантыйны тэрмін аб'екта долевага будаўніцтва павялічаны з 2 да 5 гадоў. Дзеянне ўказа не распаўсюджваецца на дагаворы стварэння аб'ектаў долевага будаўніцтва, заключаныя да ўступлення яго ў сілу.

Указ уступае ў сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання.

■ Соцыум

# ТЭРМІНОВА ПАТРАБУЕЦЦА СЯДЗЕЛКА

**Праблема, якая хвалюе многія сем'і: што рабіць з хворымі старымі? Ім патрэбна штодзённая дапамога, а сваякі... Не, яны зусім не чэрствыя людзі, проста ў іх свае сем'і, свае дзеці, праца, якая адымае шмат часу і сіл... І часта няма ніякага іншага выйсця, каб забяспечыць хвораму роднаму чалавеку годны догляд, як звярнуцца па дапамогу сядзелкі. Ці лёгка гэта ажыццявіць у нашых рэаліях? Як знайсці добрую сядзелку і наколькі дарагія яе паслугі? Дзе яшчэ можна шукаць дапамогу? Давайце разбярэмся.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Пік зваротаў прыпадае на лета

Для пачатку лепш звярнуцца ў мясцовы тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання. Многія з іх прапаноўваюць паслугі сядзелак на пазабюджэтнай аснове. Гэта значыць, зарплата сядзелцы выплачваецца з грошай, якія паступаюць ад іх падапечных. Інакш кажучы, гэтая паслуга павінна быць цалкам самаакупанай.

Прызнаемся адразу: пакуль далёка не ўсе тэрытарыяльныя цэнтры аказваюць падобныя паслугі. Спецыялісты **тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна Мінска,** у якім гэтая служба развітая, напэўна, лепш, чым дзе-небудзь, распавялі нам пра сваіх кліентаў і пра тое, хто ідзе ў сядзелкі.

— Інсульты, якія ўвесь час «маладзеюць», інфаркты, пераломы шыйкі сцягна — вось тры асноўныя прычыны, якія прыводзяць да таго, што чалавеку патрабуецца сядзелка, — кажа **спецыяліст па сацыяльнай рабоце Вольга КАМІСАРАВА.** — Пік зваротаў прыпадае менавіта на лета. Пачынаецца дачны перыяд, сезон водпускаў — людзі хочуць адпачыць. Што рабіць з хворым чалавекам? Мінчане могуць тэлефанаваць нам.

У нашым цэнтры зараз працуюць 13 сядзелак. Усе — па дагаворы падраду. Праца гэтая цяжкая, асабліва ў псіхалагічным плане, і нярэдка няўдзячная. Часам даводзіцца мець справу і са смерцю сваіх падапечных — таму сядзелка павінна быць псіхалагічна гатовая і да такога зыходу. У нас быў выпадак, калі дачка самаахвярна даглядала сваю старэнькую маці, а ўлетку наняла сядзелку, каб з'ездзіць у адпачынак. І гэтая бабуля памерла на руках у сядзелкі, на якую абрынуліся, акрамя ўсяго іншага, яшчэ ўсе фармальныя працэдуры: выклік медыкаў, міліцыі... Гэта вялікі стрэс.

Звычайная беларуская сядзелка, па словах спецыялістаў, — гэта жанчына перадпенсійнага ці пенсійнага ўзросту, якая хоча такім чынам падзарабіць.

— Маладыя валанцёры ў якасці сядзелак не падыходзяць, — лічыць Вольга Камісарава. — У нашай краіне няма навучальных устаноў, якія рыхтавалі б такіх спецыялістаў, таму патрабуецца жыццёвы вопыт. Гэта павінна быць жанчына, якая ўжо даглядала сваіх блізкіх і ўмее гэта рабіць.

**З-за старэння насельніцтва Беларусі патрэба ў сядзелках будзе ўвесь час павялічвацца.**

## Многае ўпіраецца ў матэрыяльнае пытанне

Паслуга гэтая не танная. Адна гадзіна сядзелкі ад тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Мінска каштуе ў дзённы час па буднях 19980 рублёў, ноччу (з 22 гадзін да 6) — 23250 рублёў, а ў выхадныя і святочныя дні — 28140 рублёў.

— Тэлефануюць многія, — уздыхае Вольга Камісарава. — Але далёка не ўсе замаўляюць гэтую паслугу. Многія прызнаюцца, што для іх гэта занадта дорага. Але ў нас дзяржаўныя расцэнкі. Па гэтых лічбах мы працуем з кастрычніка мінулага года.

...Калі ж паступае заказ, сядзелка прыходзіць у дом і знаёміцца са сваім будучым падапечным, глядзіць, што за сям'я, ацэньвае свае магчымасці. Часам яна можа адразу адмовіцца, і ніхто не мае права яе прымусіць. Таму што людзі бываюць розныя: ёсць і такія, хто лічыць, што ўсе вакол ім павінны. Зразумейце, гэта ж старыя хворыя людзі, з імі цяжка, у іх і хваробы, і капрызы. Але адмову ад абслугоўвання часцей можна атрымаць тады, калі сядзелка бачыць, што да яе будуць ставіцца, як да чалавека другога гатунку.

## Сядзелка па рынкавым кошце

Зараз у Беларусі ёсць шмат агенцтваў, таксама гатовых знайсці сядзелку. Калі дазваляюць фінансавыя магчымасці, то чаму б і не? А калі не дазваляюць? Мяркуйце самі: вось адно з агенцтваў па падборы хатняга персаналу, якое абяцае выбраць найбольш прыдатную для вашага выпадку сядзелку, вырашыць праблему псіхалагічнай сумяшчальнасці, дэталёва агаварыць форму занятасці (частковая, поўная, з пражываннем), азнаёміць з рэкамендацыямі з папярэдняга месца працы.

**Згодна з рашэннем Мінгарвыканкама, у сталіцы непрацаздольным грамадзянам, якія цалкам страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння (пры гэтым павінна быць медыцынскае заключэнне аб ступені страты рухальнай актыўнасці) пакрываюцца выдаткі на аплату паслуг сядзелкі тэрытарыяльнага цэнтра ў памеры да аднаго бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (сёння гэта 974.110 рублёў).**

Абяцанні вельмі добрыя, і, напэўна, сядзелка да вас прыйдзе сапраўды высокакваліфікаваная. Але і каштаваць гэта будзе нямала. За сам падбор сядзелкі прыйдзецца заплаціць агенцтву ад 140 да 200 долараў. А пагадзінная аплата будзе пачынацца ад 2,5 долара.

— Зразумейце, гэта не наша прыхамаць, не мы прыдумалі гэтыя кошты, — кажуць у агенцтве. — Гэта рынкавы кошт гэтай паслугі. За меншыя грошы людзі проста не будуць працаваць.

## Дапаможа сацыяльная актыўнасць

У Мінску ёсць Дом міласэрнасці — у прыходзе ў гонар Усіх Святых пры Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы. Ляжачага хворага можна ўладкаваць на нейкі тэрмін туды. Але каштаваць гэта будзе 450-500 тысяч рублёў за суткі.

На базе 11-й гарадской клінічнай бальніцы ў сталіцы функцыянуе аддзяленне сястрынскага догляду. Там пажылога чалавека будуць абслугоўваць спецыяльныя медсёстры. Прыкладны кошт аднаго дня знаходжання — 194 500 рублёў. І запіс — на многія месяцы наперад...

Але што рабіць, калі фінансавыя магчымасці не дазваляюць наняць сядзелку? Адпрошвацца з працы ці браць водпуск і па чарзе дзяжурыць каля ложка хворага сваяка? Дамаўляцца з пажылой суседкай, каб тая за невялікае ўзнагароджанне час ад часу заходзіла да яго, прыглядала? Якія яшчэ існуюць альтэрнатывы? Аказваецца, тут вельмі важнай можа быць ваша сацыяльная актыўнасць.

У краіне ёсць шмат грамадскіх аб'яднанняў — арганізацыі былых вязняў фашызму, таварыства бладнікаў, саюз ветэранаў і іншыя. Іх старшыні, актыў — у курсе патрэб і праблем сваіх членаў, ведаюць, каму і якая патрэбна дапамога.

— Наш цэнтр таксама супрацоўнічае з гэтымі грамадскімі аб'яднаннямі, — кажа **дырэктар Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна Мінска Алена ФІЛІМОНАВА.** — І калі яны дапамагчы не могуць, то падключаюцца нашы супрацоўнікі. Нельга ж пакінуць ляжачага чалавека ў кватэры сам-насам са сваёй бядой. Мы шукаем любую магчымасць дапамагчы. Зараз у сталіцы прапануюцца рэнтныя адносіны. Споўнілася 70 гадоў? Адзінокі? Можна заключыць дагавор з дзяржавай і атрымаць рэальную дапамогу і догляд. Пакуль заключылі такія дагаворы адзінкі, людзі прыглядаюцца... Але гэта таксама адзін з варыянтаў для пажылога нямоглага чалавека. І чым іх будзе больш — тым лепш.

**НА ДАПАМОГУ ТАКСАМА МОГУЦЬ ПРЫЙСЦІ:**

*— Чырвоны Крыж (акцэнт тут робіцца на доглядзе і аказанні медыка-сацыяльнай дапамогі дома найбольш уразлівым катэгорыям грамадзян: дзецям з абмежаванымі магчымасцямі; прыкаваным да ложка адзінокім пажылым людзям; хворым на ВІЧ);*

*— Рэлігійныя арганізацыі (напрыклад, Саюз сястрынстваў міласэрнасці Беларускай праваслаўнай царквы, які дапамагае з выкарыстаннем магчымасцяў як сястрынстваў, так і прыходаў);*

*— Абшчыны (асабліва актыўная ў гэтым плане абшчына пры Мінскім яўрэйскім абшчынным доме).*

**Святлана БУСЬКО**

■

### ЧЫМ ДАПАМОЖА СЯДЗЕЛКА?

*Сядзелка ажыццяўляе патранажны і сацыяльны догляд хворых, састарэлых і маларухомых людзей на даму. Ажыццяўляючы патранаж, сядзелка ўвесь свой працоўны час будзе знаходзіцца каля хворага, своечасова пераверне яго, перасцеле ложак, падасць судна, памяняе памперс, разагрэе ежу, пакорміць, памые посуд. А вось уколы або іншыя медыцынскія працэдуры, закупка прадуктаў у краме або аплата камунальных паслуг у службовыя абавязкі сядзелкі з ТЦСАН не ўваходзяць. На гэта ёсць медыцынскія і сацыяльныя работнікі.*

КАМЕНТАРЫЙ

### СІТУАЦЫЯ ПАВІННА ПАЛЕПШЫЦЦА

**Начальнік аддзела развіцця і каардынацыі сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Мінпрацы і сацабароны Беларусі Таццяна ФЁДАРАВА:**

Да нядаўняга часу кошт паслуг сядзелкі быў высокім. Цяпер гэтыя паслугі ўнесены ў пералік бясплатных агульнадаступных паслуг, таму будуць прадастаўляцца па сацыяльна даступных цэнах.

На ўмовах частковай аплаты гэтыя паслугі будуць прадастаўляцца малазабяспечаным адзінокім непрацаздольным грамадзянам, якія страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння. На ўмовах поўнай аплаты — усім астатнім. Бясплатна гэтая паслуга нікому аказвацца не будзе.

Акрамя таго, у самы бліжэйшы час сядзелкі будуць уводзіцца ў штат тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Яны будуць уводзіцца па патрэбе, з разліку адна штатная адзінка для прадастаўлення паслуг сядзелкі ў аб'ёме 40 гадзін на тыдзень.

Адзін чалавек можа прэтэндаваць на паслугі сядзелкі ад 10 да 40 гадзін на тыдзень пры неабходнасці. Наогул сядзелка павінна прадастаўляцца тым грамадзянам, якія страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння і пры гэтым пражываюць у сям'і. Адзінокаму чалавеку паслуг сядзелкі мала. Яму патрэбен кругласутачны догляд, і не толькі ў будныя, але і ў святочныя, і ў выхадныя дні. Выжыць адзінокаму, прыкаванаму да ложка чалавеку аднаму немагчыма! Такія людзі павінны жыць пад пастаянным наглядам. Таму адзінокім грамадзянам мы рэкамендуем прапаноўваць паслугі сядзелкі на перыяд іх афармлення ў дом-інтэрнат.

Аляксандр СУРЫКАЎ:

# «АДНОСІНЫ РАСІІ І БЕЛАРУСІ РАЗВІВАЮЦЦА ПА ЎЗЫХОДЗЯЧАЙ»

**Так ахарактарызаваў развіццё адносін паміж дзвюма краінамі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры, якая была прымеркавана да дзяржаўнага свята Расійскай Федэрацыі — Дня Расіі.**

## Спрэчкі будуць

Для разумення таго, як развіваюцца адносіны дзвюх краін, пасол параіў вывучаць статыстыку. «З пачатку 1990-х гадоў па 2012 год уключна тавараабарот вырас у дзясяткі разоў. Ні з адной краінай у нас няма такога акцэнтаванага абароту, як з Беларуссю», — сказаў дыпламат.

Па меркаванні Аляксандра Сурыкава, гэта сведчыць пра рост інтэграцыйных сувязяў, пра збліжэнне эканомік дзвюх краін. Так званыя «малочныя войны» ён назваў звычайнымі спрэчкамі бізнесу і рознагалоссем дзяржаў у пэўных часовых кропках. «Таму я не бачу ніякіх войнаў, а бачу толькі звычайнае развіццё, больш чым з усімі краінамі свету», — адзначыў дыпламат.

Аляксандр Сурыкаў падкрэсліў, што Беларусь і Расія ва ўсіх сферах: палітычнай, эканамічнай, абароннай і культурнай, — старанна каардынуюць свае дзеянні. «Любыя ўзаемаадносіны паміж краінамі маюць часам кропкі несупадзення, якія праз кансультацыі, іншыя дзеянні вырашаюцца», — сказаў ён.

Аляксандр Сурыкаў звярнуў увагу на тое, што Беларусь і Расія ўваходзяць у новы этап інтэграцыі, які, па яго меркаванні, будзе спрыяць паляпшэнню жыцця насельніцтва. «А спрэчкі былі, ёсць і будуць заўсёды. Без гэтага не развіваюцца адносіны нідзе ў свеце».

## Славянскі крой

Дыпламат назваў празмернымі патрабаванні ЕС да Беларусі. Кроіць дэмакратыю ў Беларусі пад адно лякала можа не атрымацца, сказаў ён, — у нас ёсць і славянскія адценні.

У беларускага і еўрапейскага боку цяпер пачынае складацца разуменне, што ад патрабаванняў неабходна перайсці да кансультацый і напрацоўкі прапаноў, заўважыў пасол.

Аляксандр Сурыкаў падкрэсліў, што расійскі бок не насцярожвае спроба наладжвання адносін Беларусі і ЕС. Беларусь — еўрапейская краіна, яна знаходзіцца ў цэнтры Еўропы і павінна жыць з суседзямі ў нармальных адносінах, сказаў ён. Разам з тым, расійскі бок будзе насцярожваць, калі Беларусь будзе пастаўлена ва ўмовы выбару — развіваць адносіны з Расіяй ці ЕС. Пакуль такога не адбываецца.

## Ямал — Еўропа-2

Расійскі Пасол таксама паведаміў, што канчатковае рашэнне па газаправодзе Ямал — Еўропа-2 можа быць прынята ў лістападзе.

— Пытанне яшчэ не вырашана. Пакуль польскі бок пацвердзіў сваё жаданне мець дадаткова на доўгі перыяд 15 млрд куб.м газу, — паведаміў Аляксандр Сурыкаў. — Да лістапада павінен быць падрыхтаваны адпаведны бізнес-план і тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне. Пасля гэтага пачнуцца прадметныя кансультацыі з беларускім бокам.

Раней Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін даручыў «Газпраму» вярнуцца да прапрацоўкі праекта газаправода Ямал — Еўропа-2 праз Беларусь для паставак газу ў Польшчу, Славакію і Венгрыю. На яго думку, гэта павысіць надзейнасць газазабеспячэння еўрапейскіх краін. У сваю чаргу, кіраўнік «Газпрама» Аляксей Мілер адзначыў, што прапрацоўваецца ўжо магчымасць будаўніцтва газаправода праз тэрыторыю Беларусі для паставак у Еўропу. Папярэднія перагаворы паказваюць эфектыўнасць гэтага праекта, які можа быць ажыццёўлены ў 2018-2019 гадах.

## Мадэрнізацыя — разам

Аляксандр Сурыкаў запэўніў, што расійскі бок гатовы прыняць удзел у мадэрнізацыі тых прадпрыемстваў у Беларусі, якія будуць створаны як сумесны бізнес.

— Мы знаходзімся ў Адзінай эканамічнай прасторы. Нам трэба ўзбуйняць бізнес для заваявання агульнага рынку Мытнага саюза, Адзінай эканамічнай прасторы, выходзіць потым на сусветны рынак, для чаго трэба ўзбуйняцца, мадэрнізавацца. І да гэтага мы абсалютна гатовы, — сказаў ён. — Трэба ісці да разумнага, узаемавыгаднага для абедзвюх дзяржаў эканамічнага ўзбуйнення на карысць людзей.

Пасол лічыць, што беларуская эканоміка досыць устойлівая: існуе дастатковы запас золатавалютных рэзерваў, расце ВУП і заработная плата.

## Пра «Усходняе партнёрства»

А вось «Усходняму партнёрству» Аляксандр Сурыкаў даў невысокую адзнаку: «Эканамічную прывабнасць праект мае невялікую... Я яго расцэньваю як заманьванне, таму што няма рэальных эканамічных рэчаў».

Пасол нагадаў, што фінансавы бок праекта «Усходняе партнёрства» складае каля 600 млн еўра. Праект еўразійскай эканамічнай інтэграцыі выглядае на гэтым фоне больш выгадна, паколькі ён прадугледжвае лічбы зусім іншага парадку. Аляксандр Сурыкаў нагадаў, што эканамічная інтэграцыя «тройкі» — гэта ўнутрырасійскія цэны на энерганосьбіты для ўсіх удзельнікаў. Ёсць таксама выгада па транспартных і іншых тарыфах.

Паводле слоў расійскага пасла, некаторыя недальнабачныя палітыкі хацелі выкарыстаць «Усходняе партнёрства» ў якасці інструмента ўздзеяння на Расію. Дыпламат нагадаў, што праз Беларусь і Расію ідзе каласальны паток транзіту, таму ЕС і Расія ўсё роўна будуць збліжацца і супрацоўнічаць.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Курсавая розніца

# ЕЎРА РАСЦЕ БЕСПАДСТАЎНА?

**Пасля трохтыднёвага росту долар змяніў вектар. Еўра ж мэтанакіравана рвецца ўверх. Але спецыялісты не бачаць ніякіх падстаў для такой сітуацыі.**

Справа ў тым, што падзенне долара апраўдваецца недастатковым ростам рабочых месцаў у прыватным сектары ЗША ў мінулым месяцы. А гэты паказчык вельмі цэніцца інвестарамі. У сваю чаргу, эканоміка Еўропы таксама пакуль не можа пахваліцца бліскучымі вынікамі. І хаця кіраўнік еўрапейскага Цэнтрабанка Марыа Драгі кажа, што эканоміка рэгіёна пачне аднаўляцца ўжо сёлета, яму мала хто верыць. Аднак казус у іншым: на фоне фактычна дрэннага стану еўраэканомікі курс яе валюты працягвае расці.

Калі параўноўваць з нашай нацыянальнай валютай, то за апошні тыдзень курс долара, дасягнуўшы спачатку гадавога максімуму (8700) і абнавіўшы яго (8720), у выніку застаўся на ранейшым узроўні — 8690. Еўра вырас на 200 рублёў (плюс 1,8%) да 11510. А вось расійскі рубель, знаходзячыся «ў мінорах» ужо паўмесяца, знізіўся на 3 беларускія грашовыя адзінкі (мінус 1,1%) да 270,5 беларускага рубля.

Аднак на сітуацыю ў Беларусі ўплываюць не толькі знешнія фактары. Курс нацыянальнай валюты знаходзіцца ў небяспецы яшчэ і таму, што Нацыянальны банк працягвае зніжэнне стаўкі рэфінансавання, якая з 10 чэрвеня будзе роўнай 23,5% гадавых. Са зніжэннем стаўкі пэўны адток рублёвых укладаў непазбежны. На цану рубля гэта, хутчэй за ўсё, паўплывае. Акрамя таго, за май нашы золатавалютныя рэзервы зноў скараціліся. Так, па папярэдніх даных, у вызначэнні Спецыяльнага стандарту распаўсюджвання звестак МВФ аб'ём рэзерваў скараціўся на 229 млн долараў і склаў на 1 чэрвеня 8,041 млрд. «Адмоўны ўплыў на аб'ём золатавалютных рэзерваў зрабіла значнае зніжэнне цаны на золата на міжнародным рынку каштоўных металаў. Акрамя таго, Нацыянальным банкам і ўрадам былі выкананы ў поўным аб'ёме знешнія і ўнутраныя абавязацельствы ў замежнай валюце, — каментуюць сітуацыю ў Нацбанку. — Падтрымцы ж узроўню рэзерваў паспрыяла размяшчэнне валютных аблігацый Міністэрства фінансаў Беларусі на ўнутраным рынку краіны, а таксама дадатнае сальда куплі-продажу Нацыянальным банкам замежнай валюты на Беларускай валютна-фондавай біржы».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

■ Акцэнты тыдня з Вадзімам Гігіным

# ШМАТ ПРАЦЫ...



**У нас.** Апошнім часам Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе падвяргаецца жорсткай і апраўданай крытыцы. Загадзя прадказальныя і ангажаваныя заключэнні і справаздачы пра вынікі выбараў, палітычнае развіццё той ці іншай краіны — усё гэта стала, на жаль, дрэннымі прыкметамі яе дзейнасці. У той жа час, АБСЕ па-ранейшаму застаецца адзінай арганізацыяй на еўрапейскім кантыненце, якая аб'ядноўвае і Усход, і Захад.

На гэтым тыдні нашу краіну наведала прадстаўнік АБСЕ па свабодзе СМІ Дунья Міятавіч. Раней яна ўжо неаднаразова вызначалася не самымі аб'ектыўнымі заявамі адносна стану ў медыясферы нашай краіны. Увогуле, свабода СМІ — такая тонкая матэрыя, што ў любой дзяржаве з ёй не ўсё добра. Мабыць, інакш і быць не можа. Хтосьці хоча атрымаць інфармацыю, а другі бок зусім не гарыць жаданнем ёю падзяліцца.

Свой візіт спадарыня Міятавіч правяла надзвычай інтэнсіўна. Адбыўся шэраг сустрэч і перамоў. Давялося сустракацца з нашай госцяй і мне асабіста. Які ж вынік гэтага візіту? Зразумела, шмат чакаць ад яго не даводзілася. Прадстаўнік АБСЕ па свабодзе слова — не тая персона, што прымае самастойныя палітычныя рашэнні. Дарэчы, сама Дунья Міятавіч выдатна гэта разумее і не саромеецца выказваць услых. Трэба быць рэалістамі: за адну паездку, няхай і такую насычаную, яе пазіцыя не магла пахіснуцца і стаць больш аб'ектыўнай.

І ўсё ж пэўны прагрэс ёсць. Прадстаўнік АБСЕ адзначыла станоўчыя змены, якія адбыліся ў Беларусі. Гэта і шырокі доступ людзей да інтэрнэту, прагрэсіўныя нормы новага закона аб інфармацыі і інфарматызацыі. А што да праблем, дык іх можна вырашыць толькі ў выніку сумеснай працы. «Усім бакам выпадае правесці вялікі аб'ём работы», — сказала Дунья Міятавіч. І з гэтай думкай, хоць яна і не арыгінальная, цяжка не пагадзіцца. Застаецца спадзявацца, што праца будзе сапраўды сумесная, адкрытая і шчырая. Вядома, наколькі гэта дазволіць палітычная кан'юнктура.

**Вакол нас.** На працягу мінулых двух гадоў Турцыя была ідэолагам, надзеяй і адным са спонсараў арабскіх рэвалюцый. Раптоўна рэвалюцыйныя хваляванні прыйшлі ў саму Турцыю.

Што ж адбылося? Зачэпка зразумелая — рэканструкцыя плошчы Таксім у цэнтры Стамбула. Але ясна, што прычыны хваляванняў больш сур'ёзныя і глыбокія.

Турцыя зараз перажывае перыяд уласнай «перабудовы». Кіруючая Партыя справядлівасці і развіцця ўпэўнена праводзіць палітыку радыкальных змен літаральна ва ўсіх сферах грамадства. Найперш гэта тычыцца традыцый дзяржаўнага кіравання і палітычнай культуры грамадзян. Ад усякага ўплыву на палітыку адштурхнулі ваенных, якія на працягу дзесяцігодзяў з'яўляліся фактычна пануючай кастай у Турцыі. Зроблена гэта было вельмі жорстка, суправаджалася шматлікімі арыштамі і судамі.

Поспехі палітыкі прэм'ер-міністра Рэджэпа Таіпа Эрдагана відавочныя. Краіна паказвае добрыя эканамічныя вынікі, яе міжнародны аўтарытэт узняўся да вышынь, якіх не дасягалі больш за стагоддзе. Зроблены рашучы крок да ўрэгулявання «вечнай» курдскай праблемы. Аднак у самой Турцыі ўсё больш моцна гучаць галасы тых, хто абвінавачвае прэм'ера ў аўтарытарных схільнасцях, ісламізацыі грамадства, адыходзе ад запаветаў Атацюрка, бацькі сучаснай турэцкай нацыі. Хваля пратэстаў, якую ніяк не могуць спыніць улады, дэманструе, што незадаволенасць мае даволі шырокую сацыяльную падтрымку.

На фоне масавых выступленняў у турэцкіх гарадах многія журналісты, палітыкі, нават вучоныя сталі кпіць. Маўляў, рэвалюцыйная хваля захліснула яе пачынальніцу. Але гэта недальнабачныя заявы. Так, магчыма, Турцыя праводзіла ў рэгіёне палітыку, што выклікала часам здзіўленне. Аднак дэстабілізацыя самой Турцыі на фоне нявырашаных праблем у вядучых арабскіх краінах, можа прывесці да непрадказальных наступстваў, ваеннай эскалацыі. Таму задача міжнароднай супольнасці — не паціраць далоні, назіраючы за нечаканымі цяжкасцямі ва ўсходняга льва, які, здавалася, быў на піку сваёй моцы, а дапамагчы турэцкім палітыкам выйсці з крызісу. Цяжка сказаць, каму патрэбна Турцыя як рэгіянальная звышдзяржава, але тое, што як ахопленая хаосам краіна яна не патрэбна нікому, — гэта дакладна.

**З гісторыі.** Чарговы «амаль не заўважаны юбілей». 4 чэрвеня 1918 года Браніслаў Тарашкевіч выдаў сваю «Беларускую граматыку для школ».

Не будзем зараз распавядаць пра жыццёвы лёс самаго Браніслава Тарашкевіча. Хоць яго біяграфія вельмі цікавая, са шматлікімі перакрыжаваннямі, складанай ідэйнай эвалюцыяй і трагічным фіналам у 1938-м. 95-гадовы юбілей «тарашкевіцы» дае падставы паразважаць пра ўплыў той самай граматыкі на беларускую мову і культуру.

«Тарашкевіца» адлюстроўвае пачатковы перыяд развіцця сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Так, да таго часу ўжо была «Наша ніва», тварылі Янка Купала і Якуб Колас, яскрава пранеслася па небасхіле зорка Максіма Багдановіча. Аднак калі чытаеш архіўныя дакументы дзеячаў БНР, то здаецца, што ў кожнага з іх была свая граматыка, свая мова, часам нават вельмі арыгінальная. Тарашкевіч зрабіў спробу абагульніць гэтыя розныя варыянты, прывесці да адзіных норм. І ў яго гэта атрымалася.

А мова, як жывы арганізм, развівалася далей. Так, у рэшце рэшт, з'явіўся сучасны класічны варыянт беларускай літаратурнай мовы.

У канцы 1980-х гадоў цікавасць да мовы, нацыянальнай культуры перажывала чарговы ўздым. Народ паступова аднаўляў свае карані, імкнуўся зразумець сваю адметнасць у свеце. Але працэс гэты ішоў натуральна, павольна, развіваўся эвалюцыйна. І што ж зрабілі «найбольш свядомыя прадстаўнікі інтэлігенцыі»? Адразу пачаліся спрэчкі, якой мовай пісаць — акадэмічнай, ці тарашкевіцай? Як пісаць: «снеданне» ці «сьнеданьне»? «Амбасада» ці «пасольства»? Як вымаўляць: «газЕта» ці «газЭта»? І ў рэшце рэшт, а ці не перайсці ўвогуле на лацініцу? Гэта як з бясконцымі школьнымі рэформамі таго часу: з пятага класа адразу ў сёмы. Розныя рэдакцыі, цэнтры, інстытуты, таварыствы, дзеячы ўнеслі тады вялікую блытаніну ў беларускае нацыянальнае культурнае жыццё.

Браніслаў Тарашкевіч зрабіў сваю справу, вельмі патрэбную для таго часу, і дзякуючы гэтаму застаўся ў гісторыі. А наша пакаленне павінна зрабіць свой уклад у развіццё роднай мовы.

Уточнение к объявлению,
опубликованному в газета «Звязда» № 100 от 04.06.2013 г.

**ОАО «Белтрубопроводстрой»**

г. Минск, ул. Богдановича, 129

**сообщает, что 25 июля 2013 года в 11.00 в конференц-зале акционерного общества по адресу: 220123, г. Минск, ул. Богдановича, 129 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

**1. Досрочное прекращение полномочий членов Совета директоров Общества, избранных на Общем собрании 22.03.2013 г.**

**2. Избрание нового состава Совета директоров Общества.**

Собрание проводится в очной форме. Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, **15 июля 2013 года.** Предложения по кандидатурам в состав Совета директоров будут приниматься **с 06 июня 2013 г. по 18 июня 2013 г.**

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Богдановича, 129 в рабочие дни с 18 июля 2013 г.**

**Регистрация участников собрания с 9.00 до 10.45 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.**

**Сведения по телефонам: 334 30 31, 334 33 83.**

УНП 100364117

*Совет директоров.*

Утерянный представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0420550 **считать недействительным.** УНП 101883943

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 21 (191)

# СІМВАЛ ШЧАСЦЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Шчасце стала сёлета адным з герояў фестывалю. Калі не галоўным (бо тут ёсць асобы, якія выступаюць, спяваюць, прамаўляюць), то няўлоўным, затое адчувальным. Увесь горад Маладзечна ў гэтыя дні фактычна становіцца сімвалам беларускага шчасця. Вуліца патанае ў песнях. Яны гучаць на розных пляцоўках паблізу цэнтральнай плошчы. Спяваюць народныя калектывы, людзі, якія не могуць не спяваць, калі душа гэтага просіць. А яна просіць: беларуская народная песня — як выхад у астрал і асаблівая духоўная практыка, якая ўзвышае душу і здольная кожнаму даць адчуванне радасці жыцця. А вось яшчэ цікава, калі спяваюць дзеці. У іх у рамках фестывалю сваё шчасце: назваў пераможцаў рэспубліканскі дзіцячы конкурс юных выканаўцаў «Маладзічок». Назва канцэрта, які прыехаў у пасёлак Чысць, сімвалічная: «Маладзічок запальвае зоркі». Слова «зоркі» сёння адно з найпапулярнейшых у Беларусі. Нам вельмі патрэбны «зоркі» — маленькія і маладыя, якіх увесь час расціў маладзечанскі фестываль. «Зоркі» і магчымая зорнасць існуе ў нашай свядомасці як паралельны сусвет, дзе магчыма ўсё, нават немагчымае. Стаць «зоркай» — гэта як выйсці ў адкрыты космас і дакрануцца да антыматэрыі, якая захоўвае таямніцы Сусвету. Нехта дзеля гэтага будуе андронны калайдар, а нехта спасцігае сусвет праз сваю самасць. Ну хіба мы сёння не разважаем пра тое, што цэнтр гэтага сусвету — мы, тыя, хто жыве ў Беларусі, вакол каго круціцца жыццё, хто можа дабіцца ўсяго, чаго захоча, нягледзячы ні на якія знешнія абставіны? У дні фестывалю Маладзечна і з'яўляецца цэнтрам сусвету — прынамсі, для такіх думак робіцца ўсё. І гэта таксама асаблівасць нашага шчасця, яго хоць і спрабуюць вымераць нейкімі эквівалентамі, але гэта па азначэнні немагчыма, таму што ўсе мы ведаем: шчасце — гэта калі душа пяе...

А пад песню і справа лепш ідзе. Традыцыйны «Горад майстроў» — дэманстрацыя таленту і айчыннага крэатыву, як вырабіць нешта карыснае для дома ці прывабнае для ўпрыгожання з простых матэрыялаў, якія літаральна пад рукамі: саломы, лазы, дрэва. І гэтаму можна нават павучыцца: у нас жа лепшы падарунак той, які зроблены сваімі рукамі. І гэта частка нашага несумненнага шчасця — нешта ўмець рабіць самому. А гэтая праца сама па сабе — проста песня.

Вось такое адчуванне ў Маладзечне ў гэтыя дні на кожным кроку. У любое надвор'е. Таму што на вуліцах створаны магчымасці, каб людзі маглі сябе ашчасллівіць. Песні — як мантры, якія паўтараюцца для людзей ад фестывалю да фестывалю, выконваючы сваё найвышэйшае прызначэнне: даючы адчуванне ўпэўненасці ў тым, што ў нас тут і цяпер усё добра і па-беларуску трывала, прадумана. А галоўнае — ёсць глеба для цудоўнай будучыні. Вось і пацвярджэнне: такі Амфітэатр пабудавалі ў раённым горадзе, што на ўсю краіну розгалас ідзе. Натуральна, трэба яго запаўняць мерапрыемствамі, у шэрагу якіх беларуская песня. Створаны ўсе ўмовы, каб мы радаваліся: гэта ж ёсць!.. У пэўным месцы, у пэўны час.

Колькі гадоў ездзіла ў Маладзечна, кожны раз пасля фестывалю ў душы ўзнікала якая-небудзь вельмі пранікнёная беларуская мелодыя — як зорка з неба, якая не дорыць яркага бляску, затое ў начны час дадае свайго далёкага мільгацення, якое адключыць немагчыма. І гэта на мой погляд — шчасце.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## НАЙВЫШЭЙШЫ ПІЛАТАЖ

**Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» атрымаў пастаянную акрэдытацыю ФІАПФ (FIAPF) у рамках 66-га Міжнароднага Канскага кінафестывалю.**

У 2011 і 2012-м гадах кінафестываль «Лістапад» атрымліваў часовую акрэдытацыю ФІАПФ, але гэтым разам нашаму кінафестывалю далі пастаянную. Выдатны падарунак юбілейнаму XX Мінскаму міжнароднаму кінафестывалю «Лістапад», які пройдзе сёлета з 1 па 8 лістапада.

ФІАПФ — гэта Міжнародная федэрацыя асацыяцый кінапрадзюсараў. Арганізацыя складаецца з 31 члена (сяброўасацыяцый) з 25 краін свету, якія выпрацоўваюць кінапрадукцыю. ФІАПФ акрэдытоўвае фестывалі за высокую якасць іх арганізацыі. Патрабаванні асацыяцыі да фестываляў уключаюць такія крытэрыі, як добрыя арганізацыйныя рэсурсы на працягу года, сапраўды міжнародны выбар фільмаў і конкурсных журы, размяшчэнне міжнародных карэспандэнтаў, дбайныя захады па прадухіленні пірацтва, падтрымка з боку мясцовай кінаіндустрыі, страхоўка ўсіх копій фільмаў, высокія стандарты афіцыйных публікацый і інфармацыйнага забеспячэння (каталог, праграмкі, флаеры).

Акрэдытацыю ФІАПФ маюць больш за 50 кінафестываляў найвышэйшага класа, у іх ліку Берлінскі, Венецыянскі, Канскі, Манрэальскі, Маскоўскі і многія іншыя. Цяпер да гэтага спіса далучыўся і наш «Лістапад».

**Ул. інф.**

## НА «БРАМЕ» ЧАКАЮЦЬ «ПЕСНЯРОЎ»

**У суботу ў Ружанскім палацы трэці раз пройдзе абласны фестываль «Ружанская брама». Паводле інфармацыі арганізатараў, сёлета крыху зменіцца музычная стылістыка свята — стане болей камернай музыкі.**

А яшчэ пашыраецца тэрыторыя фэсту, на гэты раз мерапрыемствы «Брамы» пачнуцца з гарадскога пасёлка Ружаны. На гарадской плошчы адбудзецца закрыццё абласнога пленэра рэзчыкаў манументальнай скульптуры. Майстры разьбы за дзесяць дзён падрыхтавалі творы на тэму роду Сапегаў і гісторыі Ружан часоў Магдэбургскага права. 12 дубовых скульптур на памяць аб свяце ўпрыгожаць Ружанскі парк.

Кірмаш і выставы-продажы цяпер таксама будуць наладжаны ў пасёлку. У будынку пасялковага Савета адбудзецца канферэнцыя на тэму «Віртуальная рэканструкцыя спадчыны Ю. Крашэўскага».

А ўвечары ўдзельнікаў свята чакаюць канцэртныя праграмы як мясцовых, так і сталічных артыстаў. Да ружанцаў маюць прыехаць заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі», дзяржаўны ансамбль «Песняры».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ФІЛОСАФ НА ПЛОШЧЫ

## Ці гатовыя мы да ўспрыняцця карцін Казіміра Малевіча?

**На плошчы Якуба Коласа ў Мінску распачалася выстава рэпрадукцый карцін Казіміра Малевіча ў рамках праекта «Мастак і горад». Мітуслівае адкрыццё з мімамі і хадулістамі, без якіх чамусьці не абыходзіцца сёння ніводнае мерапрыемства, наўрад ці спрыяла разуменню творчасці мастака. І хоць зразумела — калі мастацтва выходзіць на вуліцу, яно павінна быццам бы стаць прасцей, каб нават мінакі маглі скеміць, у чым справа. Але не настолькі ж.**

Калі сцісла, то гэтым разам людзей на адкрыцці выставы было значна менш, чым на аналагічнай леташняй, прысвечанай творчасці Марка Шагала. Адчувалася — яны былі ў нейкай разгубленасці. І не дзіўна: рэкламная частка на экспанаваных стэндах займала бадай цэнтральнае месца і прыцягвала на сябе ўсю ўвагу; анатацыі да карцін аказаліся альбо занадта прымітыўнымі, альбо проста не ілюстравалі сутнасці і не расказвалі нічога цікавага (да таго ж мноствам памылак друку). А з кароткай хронікі жыцця Малевіча на самым першым стэндзе наогул не зразумела, з чаго раптам у Мінску з'явілася такая выстава. Там шмат недакладнасцяў і без таго недакладнай біяграфіі Малевіча, які быў, па сутнасці, і можа лічыцца сёння нацыянальным беларускім геніем. Які нарадзіўся ля беларускага мястэчка Копыль і ў сям'і якога размаўлялі па-беларуску, а ў свае навуковыя працы Малевіч устаўляў беларускія словы, якія часам неабачліва называюцца паланізмамі. Карацей, усё яшчэ няма прарока ў сваёй айчыне...

Крыўдна, што такая высакародная задума — прасвятляць і раскрываць «белыя плямы» беларускага мастацтва, ператварылася ў нейкую прафанацыю, і шырокай грамадскасці прапануецца скажонае бачанне жыцця і творчасці Малевіча.

У рускамоўным украінскім часопісе біяграфій славутасцяў, які выпадкова трапіў мне ў рукі, можна прачытаць, што ў апошнія гады жыцця, калі Малевіч выкладаў у Кіеўскай мастацкай вучэльні, ён кантактаваў са сваімі студэнтамі на трохі русіфікаванай украінскай мове, якую, як і польскую, ён ведаў з дзяцінства. І гэта, маўляў, відаць па стэнаграмах, якія захаваліся. Сёння такія сцвярджэнні выклікаюць адно — лёгкую ўсмешку. Галоўнае, каб яна не перайшла ў лёгкае раздражненне ад спрадвечнай несправядлівасці таго, што мы не цэнім сваіх герояў...

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**



**Кагосьці мастацтва Казіміра Малевіча прымушае задумацца, а кагосьці — не. Але насамрэч ці так пазіцыянуецца творчасць Малевіча, як мусіла б? Сёння яго ўспрымаюць больш, чым нейкага абстракцыяніста і прымітывіста, чым як беларускага філосафа ад мастацтва. Маляванне для яго было ўсяго толькі спосабам данесці свае ідэі. Але ў анатацыях да рэпрадукцый карцін Малевіча, якія прадстаўлены на выставе, мы наўрад ці прачытаем нешта падобнае. Не прачытаем мы там і ніякіх цікавінак з жыцця мастака. Куды там, калі на стэндзе з біяграфіяй не пазначана нават месца нараджэння!**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



**Траюрадны пляменнік Малевіча, прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук, аўтар кнігі «Казімір Малевіч. Узыходжанне на крыж лёсу» Ігар Малевіч таксама прыйшоў на выставу. І саму ідэю ўхваляе. Але ён расстроены нядобрасумленным падыходам да справы. «Сама па сабе выстава цудоўная, — лічыць Ігар Аляксандравіч. — Але падбор карцін няправільны, рэкламы больш, чым карцін, і ўсё, што напісана ў анатацыі — абсалютная выдумка, прымітывізм і не тлумачыць сутнасць мастацтва Казіміра Малевіча. Вы ва ўніверсітэце праходзілі філасофію Гегеля, дык вам паўгода расказвалі, што гэта значыць. Гэтак жа трэба расказваць, і што такое мастацтва Казіміра Малевіча. Што такое супрэмус, гэта лацінскае слова, ліцвінскі тэрмін, які азначае найвышэйшы сэнс. Сам Малевіч быў ліцвінам, гігантам думкі, якога абысці ніхто не можа. А стаўленне да яго такое прымітыўнае. Гэта ненармальна. Вазьміце, апублікуйце вытрымкі з маёй кнігі, я дазваляю, няхай людзі пачытаюць, што ўсё гэта значыць».**

# ДЖАЗ! ДЖАЗ! ДЖАЗ!

## Сёння ў Мінску распачынаюцца бясплатныя джазавыя канцэрты

**Па вечарах на працягу трох суботніх дзён (8, 15 і 29 чэрвеня) ля сталічнай ратушы будуць адбывацца абсалютна бясплатныя канцэрты «зорак» сусветнага джазу з ЗША, Еўропы і Беларусі. Што ж яны ў нас забылі?**

А іх запрасілі ўзяць удзел у праекце «Джазавыя суботы ля ратушы», які пры падтрымцы Упраўлення культуры Мінскага гарвыканкама, а таксама канцэртнага агенцтва «Эквілібрыум АРТС», банка «БелВЭБ» і аўтацэнтра КІА «Атлант-М Баравая» ладзіць Міжнародны сацыяльна-эканамічны фонд «Ідэя».

Канцэрты будуць адбывацца непасрэдна ля ратушы з боку канцэртнай залы «Верхні горад». Тут могуць размясціцца каля 3 тысяч гледачоў. Прычым уласна каля сцэны будзе арганізаваны нават невялічкі сядзячы партэр.

У першую канцэртную суботу, то бок сёння, выступяць Шэнда Рул (ЗША) разам з беларускім джаз-бэндам Apple Tea. А таксама гурты Exullet Trio (Францыя) і нават індзі-каманда Pur:Pur (Украіна).

Уся праграма джазавых вечароў абяцае быць вельмі стракатай. Вы пачуеце і сучасны еўрапейскі джаз, і традыцыйны амерыканскі, і малады беларускі. Абяцаюць і выступленне 74-гадовага ветэрана амерыканскага джазу Эдзі Хендэрсана, які першы ўрок атрымаў ад легендарнага Луі Армстранга.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

■ Імпрэза

# Жыццё без лялькаводаў

## Лялькі, якія прыехалі з Расіі, запрашаюць на выставу-баль

**Баль — гэта так рамантычна, так узнёсла і прыгожа! Але хто пра гэта цяпер ведае дакладна, хто захоўвае ўспамін пра тое, як гэта было калісьці? Людзі, якія аднаўляюць той дух у ляльках, даюць адчуванне непаўторнасці розных часоў. Такія лялькі да нас прыехалі з Санкт-Пецярбурга — не цацкі, але творы мастакоў, якія заўважаюць і прапаноўваюць нейкі вобраз, які альбо нараджае думкі пра мінулае, альбо дае глебу ўявіць, якім можа быць чалавек будучыні, як выглядаць. Выстава «Лялечны баль Паўночнай Пальміры» месціцца ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі.**

Баль — нешта такое, чаго цяпер няма. Але так хочацца паспрабаваць. «Калі ласка» — заклікаюць лялькі рарытэтныя, вядомых вытворцаў XIX — пачатку XX стагоддзя. «А нас запрашаеце?» — звяртаюцца да іх лялькі сучасныя, створаныя аўтарамі, якія ўваходзяць у Міжнародную гільдыю майстроў ці Аб'яднання лялечнікаў Санкт-Пецярбурга. Іх запрашаюць — як запрашаюць і іх творцаў, у якіх бы гарадах яны ні жылі (Маскве ці Лондане, Пермі ці Северадзвінску), стварыць казку сённяшнім людзям, якія да лялек ставяцца па большасці як да цацак. 24 майстры, творы якіх прадстаўлены на выставе, сцвярджаюць: яны жывыя, таму што творчасць заўсёды нясе адбітак рук аўтара, цяпло яго душы, а можа, нават і рысы яго характару.

Ці можа быць характар у лялькі? Гэта яшчэ адно пытанне, адказ на якое будзе дзіўным, калі шукаць яго ў рамках «музейнага балю».

У лялек з фарфору характар асаблівы — вельмі чуллівы, можа трошкі халаднаваты, затое яны кранаюць сваёй вытанчанасцю і нейкай няўлоўнай элітарнасцю. Лялькі з воўны, наадварот, мяккія і падатлівыя, ад іх пахне домам і ўтульнасцю. Драўляныя зараджаюць думкамі аб трываласці і надзейнасці. Пластыкавыя ці поліўрытанавыя могуць здавацца больш сучаснымі і «прасунутымі», але ў руках майстроў нават гэтыя штучныя матэрыялы напаўняюцца жыццём і гатовыя да прыгод на балі. Прадумана ўсё нават у іх гардэробе — ад гузікаў на вопратцы да набоек на туфліках. Шыкоўныя строі, расшытыя золатам — для параднага выхаду ў свет. Але калі тканіна для сукенкі такой прыгажуні ўласнаручна саткана аўтарам — хіба гэта не па-каралеўску? Фактычна — эксклюзіў. Усё, як у людзей...

І нават для людзей. Яны могуць радаваць сваім выглядам. Сваёй унікальнасцю як творы мастакоў. Могуць напаўняць розум фантазіяй, калі літаральна тут жа, на выставе, аглядаючы нейкую прыгажуньку ля вітража, прыдумаеш ёй гісторыю, падобную да казкі. Але яны могуць нават паслужыць людзям у жыцці: бываюць жа лялькі-лямпы, якія ў літаральным сэнсе асвятляюць жыццё людзей, становяцца адмысловай дэталлю ў інтэр'еры. І яны маюць поспех у людзей розных краін. Перш чым да нас прыехаць, гэтыя лялькі ўжо зладзілі свой баль у Амерыцы і Кітаі. Затое ў нас ёсць магчымасць цягам выставы, якая будзе доўжыцца месяц, выбраць тую, якая стане каралевай балю. Але ж гэта не проста — выбіраць з усіх такіх дзівосных, фантастычных замежных лялек, дзе ёсць як ведзьмакі, так і чароўныя феі! Усе ўражваюць. Але ж гэта той выпадак, калі прыйсці на выставу — усё адно што аддаць свой голас. За мастацтва, якое бурыць межы паміж светам лялек і людзей.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

# ВОСЬ ДЫК «РОЛЯ»!

## Што вучань Таркоўскага зрабіў на «Беларусьфільме»

**Фільм «Роля» расійскага рэжысёра Канстанціна Лапушанскага, вучня Андрэя Таркоўскага, адабраны ў асноўны конкурс 35-га Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю, які пройдзе з 20 па 29 чэрвеня. Журы фэсту сёлета ўзначаліць іранскі рэжысёр Махсэн Махмальбаф (тут усе аматары кінематографа павінны ўстаць, я не жартую!).**

Для айчыннага кіно гэта таксама не абы-якая падзея. Рэч у тым, што Лапушанскі здымаў свой фільм пры падтрымцы Міністэрства культуры Беларусі і пры актыўным удзеле кінастудыі «Беларусьфільм», нашых спецыялістаў і акцёраў. І фільм сапраўды атрымаўся надзвычай нечаканым. Калі казаць шчыра, то такіх сёння проста не здымаюць. Але пра ўсё па парадку.

Фільм «Роля» — вынік той самай сумеснай кінавытворчасці, на якую ўсе ў свеце сёння арыентуюцца. І ўжо нават Беларусь. У працы над фільмам бралі ўдзел яшчэ «Ленфільм», фінская ды нямецкая кінакампаніі. І, што не дзіўна, менавіта фільмы сумеснай кінавытворчасці, у якой удзельнічае і наша краіна, становяцца для нас жа і аднымі з самых удалых кінапраектаў. І ў мастацкім, і ў стратэгічным сэнсах. Узгадайма «У тумане» Сяргея Лазніцы ды «Адзінокі востраў» Пеэтэра Сіма. Ужо само тое, што «Беларусьфільм» удзельнічаў у такім артавым праекце, вартае ўвагі і ацэнкі. І, як запэўнівае генеральны дырэктар кінастудыі Алег Сільвановіч, студыя будзе працягваць удзельнічаць у падобных арт-хаусных кінапраектах, не разлічаных на шырокага гледача і пасьпяховы лёс у кінапракаце. Вядома, усё, што не ляжыць на паверхні разумення, не з'яўляецца дынамічным і відовішчным, у масавага гледача асаблівага попыту не мае.

Стужка працягласцю трохі больш за дзве гадзіны, глядзіцца, па сутнасці, на адным дыханні. Чаму — патлумачыць цяжка. Сваю драматычную гісторыю (сцэнарысты Канстанцін Лапушанскі і Павел Фін) аўтары распавядаюць вельмі павольна, нават замаруджана. Да таго ж у неўласцівай сённяшняй масавай кінавытворчасці чорна-белай гаме. І гэта было свядомым рашэннем. Як свядомым было і рашэнне здымаць на плёнку, пра якую, бадай, усе ўжо забыліся. Для Лапушанскага чорна-белая выява і плёнка былі прынцыповымі момантамі. Яны больш нюансныя, больш дакладна перадаюць глыбіню кадра і кантраст чорна-белых плям, пейзажаў, настрояў, характараў. Дарэчы, «Роля» з'яўляецца апошнім фільмам кінастудыі «Беларусьфільм», які здымалі на плёнку. Чым далей, тым менш ахвочых карыстацца плёнкай і тым складаней гэта рабіць — усё мадэрнізуецца і ўжо не паўсюль можна знайсці неабходныя прыстасаванні для праяўлення плёнкі і далейшай працы з ёй.



Сюжэт фільма пераказаць не проста. Расповед нелінейны, сюррэалістычны, санлівы і вельмі атмасферны. Глядзіш фільм Лапушанскага і думаеш: ага, вось ён, патомны «ленфільмавец» — духам фільмаў Сакурава і абодвух Германаў так і патыхае ад «Ролі». Дарэчы, пра Сакурава. Прадзюсарам і кампазітарам «Ролі» з'яўляецца Андрэй Сігле, які працаваў у гэткіх жа амплуа і на славутым «Фаўсце» Аляксандра Сакурава.

Акцёр Максім Суханаў іграе ў фільме Лапушанскага адразу дзве галоўныя ролі. Першы яго герой — акцёр Мікалай Яўлахаў — уцякае ад пажарышчаў грамадзянскай вайны ў складзе белагвардзейскага эшалона. Але на станцыі Рытва цягнік з усімі пасажырамі трапляе ў рукі чырвонаармейцаў пад камандаваннем Ігната Плотнікава. Той сам вырашае, каго пакараць, а каго — памілаваць. Але, сустракаючыся з Яўлахавым, адчувае сябе неяк, мякка кажучы, не па сабе. Мужчыны падобныя адно на аднаго, як дзве кроплі вады. Неўзабаве Плотнікаў памірае, а Яўлахаў ратуецца, бяжыць у Фінляндыю і становіцца вядомым акцёрам. Але ідэя таго, што толькі ў сапраўдным жыцці можна сыграць сапраўдную ролю, авалодвае Яўлахавым. Ён вырашае вярнуцца ў Расію ў вобразе чырвонага камандзіра Ігната Плотнікава, якому нібыта ўдалося выжыць. І збіраецца сыграць гэтую ролю да канца...



Выдатны фільм пра вечныя мітрэнгі рускай (славянскай?) душы і пошукі Расіі. У адным эпізодзе ўрач-фін нават гаворыць жонцы Яўлахава, якая таксама з'яўляецца фінкай: «Я таксама часам зусім не магу зразумець гэтых рускіх...» І гэта яшчэ раз падкрэслівае і так не прыкрытую літаратурнасць фільма Лапушанскага. Яго героі цытуюць класікаў, узгадваюць Фрэйда і Меерхольда і наогул такія начытаныя і разумныя, што ажно няшчасныя. Але гэта ў адной рэальнасці. У Фінляндыі 1923 года. Але ў рэальнасці другой, куды трапіў Яўлахаў, ператварыўшыся ў Плотнікава, каб іграць сваю ролю, усё зусім па-іншаму. Ад яе патыхае прозай Андрэя Платонава: такой жа былтанай арыгінальнасцю мастацкай мовы, такім жа трагізмам, безвыходнасцю, чарнухай, несправядлівасцю, спрадвечным пытаннем усіх ахвяр камунізму «І дзеля чаго?..» Тут Плотнікаў жыве ў жудаснай камунальнай кватэры, населенай найцікавейшымі персанажамі-характарамі (адназ іх іграе наша Тамара Міронава), якую цалкам пабудавалі ў павільёнах кінастудыі «Беларусьфільм» пад кіраўніцтвам мастакоў-пастаноўшчыкаў Алены Жукавай і Андрэя Тоўсціка (Беларусь). У рэальнасці Расіі часоў НЭПу Плотнікаў ездзіць у душных трамваях без вокнаў і дзвярэй; сніць на плячы ў суседкі па камуналцы Вольгі нейкія чужыя сны пра рэвалюцыю (што не можа не нагадаць «Люстэрка» Андрэя Таркоўскага); ходзіць па нейкіх цёмных піўнушках, поўных чырвоных камандзіраў і сумніўных жанчын (адну з іх іграе наша Алеся Пухавая); змагаецца з сабой і вырашае, як жа лепш сыграць тую ці іншую сітуацыю. І пераконваецца: жыццё — найлепшы драматург.

> **Менавіта фільмы сумеснай кінавытворчасці становяцца для нашай краіны аднымі з самых удалых кінапраектаў.**

Адной з самых моцных сцэн фільма з'яўляецца сустрэча ў цягніку Яўлахава-Плотнікава з жанчынай (пецярбургская актрыса Наталля Парашкіна). Праўда, яе і жанчынай назваць цяжка: яна, хутчэй, забітая жыццём... істота, згвалтаваная ўласным бацькам. Яна не грэбавала «рубіць» высакародных паненак, яна крычыць, што «няма вашага Бога, усё скончылася!». Яе персанаж — апафеоз роспачы, параксізм болю. Ды, па праўдзе, і ўвесь фільм — гэта боль, які мае невытлумачальныя прычыны. У гэтым сутнасць душы, якую даследуе Лапушанскі.

Мяркуецца, што мы зможам пабачыць гэтую няпростую карціну сёлета на кінафестывалі «Лістапад».

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

«Банк, основанный на доверии»

## ЗАО «Трастбанк»

220035, г. Минск, ул. Игнатенко, 11

Форма 1 годового отчета

### КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2013 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 7.1.1. | 25 044,3 | 41 419,3 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 7.1.2. | 446,2 | 1 923,6 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 7.1.3. | 196 795,9 | 372 259,7 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 7.1.4. | 74 286,4 | 57 177,1 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 7.1.5. | 14 469,3 | 35 054,5 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 7.1.6. | 381 870,0 | 372 425,1 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 2. | 187,5 | 2 287,5 |
| 10 | Инвестиции в зависимое юридическое лицо | | 2. | 8 306,3 | 6 462,7 |
| 11 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 7.1.7. | 116 714,6 | 82 659,4 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 7.1.8. | 176,1 | - |
| 13 | Прочие активы | 1111 | 7.1.9. | 43 354,9 | 28 759,4 |
| 14 | **ИТОГО активы** | **11** | **7.1.** | **861 651,5** | **1 000 428,3** |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 7.1.10. | 46 382,7 | 45 792,9 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 7.1.11. | 69 950,0 | 90 628,9 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 7.1.12. | 484 852,5 | 600 030,0 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 7.1.13. | 67 810,7 | 104 896,8 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 7.1.14. | - | - |
| 21 | Прочие обязательства | 1206 | 7.1.15. | 10 026,3 | 11 538,4 |
| 22 | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **679 022,2** | **852 887,0** |
| 23 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 24 | Уставный фонд | 1211 | 7.1.16. | 82 657,0 | 48 785,7 |
| 25 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 26 | Резервный фонд | 1213 | 7.1.17. | 9 719,8 | 9 719,8 |
| 27 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 7.1.18. | 77 129,0 | 70 882,4 |
| 28 | Накопленная прибыль | 1215 | 7.1.19. | 13 123,5 | 18 153,4 |
| 29 | Всего капитал, принадлежащий головной организации - банку | | | 182 629,3 | 147 541,3 |
| 30 | **ВСЕГО капитал** | **121** | | **182 629,3** | **147 541,3** |
| 31 | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | **7.1.** | **861 651,5** | **1 000 428,3** |

Форма 2 годового отчета

### КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибыли и убытках за 2012 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 7.2.1. | 63 647,4 | 58 461,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 7.2.1. | 60 438,6 | 49 826,0 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 7.2.1. | 3 208,8 | 8 635,0 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 7.2.2. | 38 546,5 | 42 207,0 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 7.2.2. | 3 693,1 | 3 642,3 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 7.2.2. | 34 853,4 | 38 564,7 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 7.2.3. | 2 290,3 | 91,4 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 7.2.4. | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 7.2.5. | 10 001,5 | 8 745,0 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 7.2.6. | - | (473,3) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 7.2.7. | (1222,5) | 25 582,0 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 7.2.8. | 20 511,9 | 19 972,1 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 7.2.9. | 57 149,8 | 34 026,1 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 7.2.10. | 8 123,0 | 5 036,0 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 6 815,6 | 10 890,8 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 7.2.11. | 1 323,1 | 1 684,5 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 7.2. | 5 492,5 | 9 206,3 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | 7.2. | 1 259,9 | 1 204,5 |
| 19 | Итого прибыль (убыток) | | 7.2. | 6 752,4 | 10 410,8 |
| 20 | Базовая прибыль на простую акцию (в рублях) | | 7.2.12. | 2 211 197 | 3 453 009 |
| 21 | Разводненная прибыль на простую акцию (в рублях) | | | - | - |

Форма 3 годового отчета

### КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ об изменении капитала за 2012 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статей капитала / Наименование показателей | Символ | Уставный фонд | Эмиссионный доход | Резервный фонд | Накопленная прибыль (убыток) | Фонд переоценки статей баланса | Всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2011 г. | 3011 | 48 785,7 | - | 4 880,1 | 9 013,4 | 32 176,1 | 94 855,3 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей капитала | 3012 | - | - | 4 839,7 | 9 140,0 | 38 706,3 | 52 686,0 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 10 410,8 | 38 706,3 | 49 117,1 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 4 839,6 | (4 839,6) | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | x | - | x | - |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | 0,1 | 3 568,8 | - | 3 568,9 |
| 3 | Остаток на 1 января 2012 г. | 3013 | 48 785,7 | - | 9 719,8 | 18 153,4 | 70 882,4 | 147 541,3 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2012 г. | 3011 | 48 785,7 | - | 9 719,8 | 18 153,4 | 70 882,4 | 147 541,3 |
| 5 | Изменения статей капитала | 3012 | 33 871,3 | - | - | (5029,9) | 6 246,6 | 35 088,0 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 6 752,4 | 16 707,2 | 23 459,6 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | 7 600,0 | x | - | (7600,0) | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 11 044,7 | - | x | - | x | 11 044,7 |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 11 044,7 | - | x | x | x | 11 044,7 |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | 15 226,6 | - | - | (4766,0) | (10460,6) | - |
| 5.8 | прочие изменения (влияние курсовых разниц, округление) | 30126 | - | - | - | 583,7 | - | 583,7 |
| 6 | Остаток на 1 января 2013 г. | 3013 | 82 657,0 | - | 9 719,8 | 13 123,5 | 77 129,0 | 182 629,3 |

Приложение к Консолидированному отчету об изменении капитала

### СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2012 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | 7.2. | 6 752,4 | 10 410,8 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | 7.1.18. | 16 707,2 | 38 706,3 |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств | 3012121 | 7.1.18. | 29 011,7 | 38 706,3 |
| 2.2 | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | 7.1.18. | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | 7.1.18. | (12304,5) | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | 7.1.18. | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | 7.1.18. | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | 30121 | | 23 459,6 | 49 117,1 |

Форма 4 годового отчета

### КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о движении денежных средств за 2012 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 г. | 2011 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 63 417,3 | 52 145,2 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (60 503,6) | (47 335,7) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 40 026,1 | 42 803,9 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (3 473,4) | (3 441,3) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | 2 290,3 | 91,4 |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 2 139,3 | 14 692,1 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | - | (2 423,4) |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 20 018,5 | 16 121,9 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (58 653,9) | (35 924,8) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (1 678,5) | (2 419,1) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах, итого | 701 | | 3 582,1 | 34 310,2 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (1 537,0) | (33 544,1) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | 23 904,6 | 45 205,6 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | 8 499,9 | (15 957,6) |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (10 034,7) | 51 289,8 |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (5 687,5) | (1 711,6) |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов, итого | 702 | | 15 145,3 | 45 282,1 |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | - | 30 216,0 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 28 485,8 | 2 783,6 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | (37 925,4) | 23 845,6 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | (38 813,4) | 17 517,5 |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | (137 151,3) | 46 155,3 |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств, итого | 703 | | (185 404,3) | 120 518,0 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | (166 676,9) | 200 110,3 |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (2 310,5) | (1 618,8) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 23,6 | 27,5 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | (97,6) |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | (2 286,9) | (1 688,9) |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | 11 044,7 | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | - | - |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | 11 044,7 | - |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | (248,6) | 69 802,1 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | (158 167,7) | 268 223,5 |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 7.4. | x | 313 655,8 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 7.4. | 155 488,1 | x |

**Председатель Правления ЗАО «Трастбанк»** **В.М. Саксон**

**Главный бухгалтер** **Н.В. Бродик**

**Дата подписания «15» мая 2013 г.**

**Ссылка для годовой отчетности:**
http://www.trustbank.by/about/financial-statements/year/2012/

УНП 100789114. Лиц. № 14 от 26.04.2013 г. НБ РБ

**ООО «КПМГ»**
ул. Димитрова, 5
Помещение 9
220004, Минск, Беларусь

Телефон +375 (17) 306 08 03
Факс +375 (17) 306 08 12
Моб. + 375 29 104 75 15
Интернет www.kpmg.by

### Аудиторское заключение независимой аудиторской организации ООО «КПМГ» по годовой консолидированной финансовой отчетности Закрытого акционерного общества «Трастбанк» за 2012 год

Акционерам и руководству Закрытого акционерного общества «Трастбанк»
ул. Игнатенко, 11
г. Минск
Республика Беларусь
220035
ЗАО «Трастбанк» зарегистрировано
в Национальном банке Республики Беларусь 09.11.1994,
регистрационный номер 53.

Исх. номер 1505-01

Мы провели аудит прилагаемой годовой консолидированной финансовой отчетности Закрытого акционерного общества «Трастбанк» (далее – «Банк») и его зависимой компании (далее – «Банковский холдинг»), состоящей из консолидированного бухгалтерского баланса на 31.12.2012, консолидированного отчета о прибыли и убытках, консолидированного отчета об изменении капитала и консолидированного отчета о движении денежных средств за 2012 год, а также пояснительной записки.

*Ответственность руководства относительно годовой консолидированной финансовой отчетности*

Руководство Банковского холдинга несет ответственность за подготовку и объективное представление годовой консолидированной финансовой отчетности в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, а также за систему внутреннего контроля, которая, по его мнению, является необходимой для подготовки годовой консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, вызванных мошенничеством либо ошибкой.

*Ответственность аудиторов*

В наши обязанности входит выражение мнения о годовой консолидированной финансовой отчетности на основе проведенного нами аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь и Международными стандартами аудита, если они не противоречат названным требованиям. Эти стандарты и требования обязывают нас соответствовать этическим требованиям и планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить разумную уверенность в том, что годовая консолидированная финансовая отчетность не содержит существенных искажений.

Аудит включает в себя проведение процедур для получения аудиторских доказательств по суммам и раскрытиям, представленным в годовой консолидированной финансовой отчетности. Отбор процедур проводится на основании суждений аудитора, включающих оценку риска наличия существенных искажений в годовой консолидированной финансовой отчетности, вне зависимости от того, явилось ли их причиной мошенничество или ошибка. При оценке данного риска аудитор рассматривает работу системы внутреннего контроля, относящуюся к подготовке и объективному представлению годовой финансовой отчетности Банковского холдинга, в целях разработки соответствующих аудиторских процедур, но не в целях выражения мнения об эффективности работы самой системы внутреннего контроля Банковского холдинга. Аудит также включает в себя оценку приемлемости используемой учетной политики, обоснованности оценочных значений, сделанных руководством Банковского холдинга, и оценку общего представления годовой консолидированной финансовой отчетности.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства обеспечивают достаточные и надлежащие основания для выражения нашего условно положительного аудиторского мнения.

***Основание для выражения условно положительного аудиторского мнения***

В течение 2012 года Банк признал доход, вероятность получения которого нельзя оценить как высокую. В соответствии с Инструкцией по признанию в бухгалтерском учете доходов и расходов в Национальном банке Республики Беларусь и банках Республики Беларусь, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 30.07.2009 №125, доход признается в бухгалтерском учете при условии, что существует безусловная (высокая) вероятность получения дохода. Если бы соответствующие доходы не были признаны, то прочие активы и нераспределенная прибыль должны были быть уменьшены на 9281,1 миллиона белорусских рублей на 31 декабря 2012. Также чистая прибыль за 2012 год должна была быть уменьшена на 9281,1 миллиона белорусских рублей.

В течение 2012 года Банк признал доход от списания кредиторской задолженности в сумме 8570,0 миллионов белорусских рублей. В соответствии с нормами законодательства Республики Беларусь, списание кредиторской задолженности Банком не обоснованно. Если бы соответствующие доходы не были признаны, то прочие обязательства должны быть увеличены и нераспределенная прибыль должна быть уменьшена на 8570,0 миллиона белорусских рублей на 31 декабря 2012. Также чистая прибыль за 2012 год должна была быть уменьшена на 8570,0 миллиона белорусских рублей.

По состоянию на 31 декабря 2012 Банком не в полной сумме сформирован резерв по кредиту должника, имеющего признаки финансовой неустойчивости. В соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, такой кредит должен быть классифицирован по третьей группе кредитного риска с последующим формированием резерва в размере 30% актива. Если бы резерв по кредиту был создан в полном размере, то кредиты клиентам и нераспределенная прибыль должны быть уменьшены на 4970,6 миллиона белорусских рублей на 31 декабря 2012. Также чистая прибыль за 2012 год должна была быть уменьшена на 4970,6 миллиона белорусских рублей.

*Аудиторское мнение*

По нашему мнению, за исключением корректировок, в отношении аспектов, указанных в разделе «Основание для выражения условно положительного аудиторского мнения», годовая консолидированная финансовая отчетность достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение Закрытого акционерного общества «Трастбанк» и его зависимой компании на 31.12.2012, а также результаты финансово-хозяйственной деятельности и движение денежных средств Банковского холдинга за 2012 год, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, касающимися подготовки годовой консолидированной финансовой отчетности.

**Директор** **Верещагина Ирина Владимировна**

**Руководитель аудиторской группы** **Абойшева Анна Михайловна**

**«15» мая 2013 года**

г. Минск, Республика Беларусь

Общество с ограниченной ответственностью «КПМГ»

Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским горисполкомом на основании решения от 10.02.2011, УНП 191434140

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

**«Строительство многоэтажного жилого дома со встроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой № 10 по генплану в микрорайоне Каменная Горка-2».**

Общество с ограниченной ответственностью «Футбольный клуб «Сквич» информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства.

**Информация о Застройщике.**

ЗАСТРОЙЩИК (Заказчик) – ООО «Футбольный клуб «Сквич».

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 26 ноября 2004 года № 2391 в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей за № 190583075.

В течение предыдущих лет организацией осуществлялось строительство 3-х многоэтажных жилых домов серии М 111-90 в границах улиц Одоевского, Бельского, Пономаренко во Фрунзенском районе города Минска, генподрядчиком которых являлась строительная организация ОАО «МАПИД».

**Информация о проекте.**

**Цель строительства –** ввод в эксплуатацию жилого дома, со встроенными помещениями и подземной гараж-стоянкой № 10 по г/п в микрорайоне Каменная Горка-2.

**Объект долевого строительства –** многоквартирный жилой дом № 10 по генплану, монолитно-каркасный со стенами из газосиликатных блоков, состоит из пяти 12-16-18-этажных секций, со встроенными помещениями общественного и административного назначения на первом этаже и встроенно-пристроенным гаражом-стоянкой на 144 машино-мест (304-квартирный жилой дом), с техническим подпольем и теплым техническим чердаком, высота жилых этажей – 2,6 метра. Категория комфортности по шуму – «В». Потолки: монолитно-железобетонные плиты. Стены – блоки из ячеистого бетона; перегородки – кирпичные (из полнотелого и пустотелого керамического кирпича). Полы – железобетонная плита (стяжка). Вентиляция жилых помещений – естественная. Отопление, электричество, водоснабжение, канализация – городские сети с индивидуальными приборами учета.

Секция оснащена 2 лифтами грузоподъемностью 400 кг и 630 кг и мусоропроводом.

**Наружная отделка :** стены – окраска фасадными красками; утепление, металлические элементы окрашиваются эмалями. **Общая площадь квартир – 19999,76 кв. метров. Всего – 304 (триста четыре) квартиры.**

Участок для строительства жилого дома расположен во Фрунзенском районе в городе Минске, система подъездов к проектируемой застройке организована с улиц Проектируемая № 2 – Проектируемая – № 4 на застраиваемой территории.

**Благоустройство территории:** включает подъезд к дому, озеленение, пешеходные дорожки, аллеи, устройство детской и взрослой площадки для отдыха, организацию проездов и гостевых автостоянок, а также площадки для хозяйственных нужд с установкой на них оборудования и малых архитектурных форм.

Для привлечения физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей предлагаются к строительству по договорам создания объекта долевого строительства **20 (двадцать) квартир, из них:**

**- однокомнатные –** минимальной общей площадью от 47,16 кв.м – 10 (десять) квартир; максимальной стоимостью 1400 долларов США;

**- двухкомнатные –** минимальной общей площадью от 62,34 кв.м – 10 (десять) квартир; максимальной стоимостью 1400 долларов США;

**- трехкомнатные –** минимальной общей площадью от 85,76 кв.м – 10 (десять) квартир; максимальной стоимостью 1400 долларов США;

**- машино-места,** связанные с Объектом долевого строительства – стоимостью 19 999 долларов США при 100% оплате, стоимостью 24 000 долларов США с рассрочкой до 24 месяцев.

**Оплата производится в эквиваленте в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату платежа.**

**Отделка квартир не выполняется.**

Все квартиры – имеют летние помещения (лоджии), окна – из профиля ПВХ.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические помещения и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

**Характеристика встроенных помещений.**

В жилом доме в секциях 1 и 2 располагаются нежилые помещения общественного назначения. Звукоизоляция между помещениями организована согласно норм.

**Строительство производится при наличии следующих документов:**

- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденного 04 марта 2009 года Председателем Минского городского исполнительного комитета;

- свидетельство (удостоверение) № 500/727-5423 о государственной регистрации;

- решение на строительство Минского городского исполнительного комитета № 659 от 17.03.2011 г.;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «ГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗА по городу Минску» № 1667-15/10 от 03.01.2011 г.;

- договор строительного подряда - ИП «ГЕРБЕЛИНТОРГТРАНС» № СП-42/07/12 от 05.07.2012 года;

- выданное органом государственного строительного надзора разрешения на производство строительно-монтажных работ **от 30.11.2012 г. (№ 2-208 Ж- 029/11).**

Начало строительства – 2 квартал 2011 года.

Нормативная продолжительность строительства жилого дома по г/п №10 – 29,2 месяца. Предложение, указанное в настоящей Проектной декларации долевого строительства, действует до момента опубликования новой проектной декларации.

Подробные сведения об объекте долевого строительства и условия заключения договоров на строительство можно получить по адресу: 220082, г. Минск, ул. Притыцкого, 34, подъезд 4, офис 1.

**Тел. для справок: 8 029 605 09 09, 216 91 44, 216 91 45.**

**Режим работы:** понедельник – пятница с 08.30 до 17.30, обед: с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

**в частную собственность граждан в Ушачском районе Витебской области**

### Организатор: Веркудский сельский исполнительный комитет

| Лот | Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый номер | Условия и ограничения, инженерно-геологические условия* | Сумма подлежащих возмещению затрат на оформление и регистрацию участка, руб. | Начальная цена лота, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Городок, Ушачского р-на Витебской обл., площ. 0,1671 га, кадастровый № 224980902101000040 | -земли в водоохранных зонах водных объектов оз. Паульское | 3920980 Кроме того, расходы на организацию и проведение аукциона | 20 000 000 |
| 2 | д. Городок, Ушачского р-на Витебской обл., площ. 0,1664 га, кадастровый № 224980902101000041 | -земли в водоохранных зонах водных объектов оз. Паульское | 3920980 Кроме того, расходы на организацию и проведение аукциона | 20 000 000 |
| 3 | д. Горы 1, д. 6 Ушачского р-на Витебской обл., площ. 0,2282 га, кадастровый № 224980902601000013 | -земли в водоохранных зонах водных объектов оз. Черствядское | 3771860 Кроме того, расходы на организацию и проведение аукциона | 10 000 000 |
| 4 | д. Городок Ушачского р-на Витебской обл., площ. 0,2359 га, кадастровый № 224980902101000042 | -земли в водоохранных зонах водных объектов оз. Паульское | 3950950 Кроме того, расходы на организацию и проведение аукциона | 20 000 000 |

**** инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ, здания на участках отсутствуют. Условия развития инфраструктуры: возможность подключения к инженерным сетям.***

Целевое назначение участка — для строительства и обслуживания жилого дома, назначение в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества 1 09 02 — земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома).

**1. Аукцион состоится 9 июля 2013 года в 12.00 в здании Веркудского сельского исполнительного комитета по адресу: 211493, аг. Веркуды, ул. Школьная, д. 13 Ушачского р-на Витебской обл., 2-й этаж.** Заявления и пакет документов на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений и документов **05.07.2013 г. до 17.00.**

Заключительная регистрация участников **09.07.2013 года с 10.00 до 12.00** по месту проведения аукциона.

2. Аукцион проводится в соответствии с Положением, утв. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Условие — наличие не менее двух участников.

3. К участию допускаются: граждане, либо юридические лица (РБ), подавшие документы в соответствии с п. 4 настоящего извещения. Задаток за участие в аукционе составляет 10% от начальной цены лота. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3600328021937 ф-л № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Полоцк, код 150801648, УНН 300007073, код платежа 04901, получатель — Веркудский сельисполком.

4. Участнику необходимо в срок, указанный в извещении, подать заявление и подписать Соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и предоставить следующие документы: копию платежного документа о внесении задатка, копию документа, содержащего идентификационные сведения о гражданине без нотариального засвидетельствования, представителю гражданина — нотариально удостоверенная доверенность.

5. Условия:

5.1. Внести определенную в ходе торгов цену продажи земельного участка (за вычетом суммы задатка) на расчетный счет Веркудского сельисполкома.

5.2. Возместить затраты по формированию и регистрации создания земельного участка и расходы на организацию и проведение аукциона.

5.3. В течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона обратиться за гос. регистрацией прав на земельный участок в Лепельский ф-л РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

5.4. Получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома.

5.5. Приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права частной собственности на зем. участок.

**Контактные номера тел.: 802158 25424, 802158 25447.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Кировске**

**Организатор проведения аукциона –** КИРОВСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ Могилевской области

| Адрес и площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы, связанные с формированием и регистрацией земельных участков (руб.) | Характеристика земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|
| г. Кировск, ул. Кирова, центральный рынок – 0,0031 га, торговый павильон № 1 (земельный участок для размещения объектов розничной торговли), срок аренды 25 лет | 722550100001002864 | 688 360 | 137 672 | 4 222 214 | Для всех участков – рядом электричество, централизованные водоснабжение и водоотведение |
| г. Кировск, ул. Орловского, напротив ф-ла РУП «Могилевоблгаз», платная автомобильная стоянка (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей) – 1,00 га, срок аренды 25 лет | 722550100001002878 | 180 779 904 | 36 155 981 | 3 362 730 | |
| г. Кировск, пересечение улиц Калинина и Орловского, торговый павильон (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) – 0,0048 га, срок аренды 30 лет | 722550100001002909 | 758 614 | 151 723 | 7 037 784 | |

**Аукцион состоится 15 июля 2013 г. в 16.15 по адресу: г. Кировск, ул. Кирова, 80, 1 этаж, зал заседаний. Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (землеустроительная служба Кировского райисполкома) по адресу: г. Кировск, ул. Пушкинская, 21а, каб. 8 в рабочие дни с даты опубликования извещения до 17-00 9 июля 2013 г. Заключительная регистрация участников аукциона 15 июля 2013 г. с 15.00 до 15.30.**

**Информация о земельных участках по контактному телефону в г. Кировске: (8 02237) 25 4 96 и по адресу: ул. Пушкинская, 21а, каб. 8.**

*Для участия в аукционе на право заключения договора аренды земельного участка приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица. Участнику необходимо в срок, указанный в извещении, подать заявление и представить в уполномоченную организацию заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Кировского райфо 3602717000012 в ЦБУ № 709 г. Кировска, филиал № 703 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бобруйска, код 760, код платежа 04002; кроме того, в комиссию представляется гражданином копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.*

*При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.*

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Аукцион проводится при наличии двух и более участников. Не допускается начало торгов по начальной цене. Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Участник аукциона, ставший победителем, либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

- в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка и оплатить расходы по публикации извещения в средствах массовой информации;

- заключить с Кировским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок;

- получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года;

- приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта;

- завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с земельными участками.

Краіна здароўя
Выпуск № 6 (307)

# ЗБОРЫ Ў ДАРОГУ

## Адпраўляем дзіця ў загарадны летнік

**Аптымальным узростам для першага самастойнага адпачынку ў загарадным летніку псіхолагі лічаць 9-10 гадоў. У гэтым узросце дзіця ўжо мае пэўны вопыт стасункаў з равеснікамі, не так моцна залежыць ад апекі дарослых і, магчыма, нават не супраць яе крыху паменшыць. Да таго ж некаторыя дзеці маюць вопыт адпачынку ў летнім школьным лагеры.**

### Бліжэй да дому

Калі вы адпраўляеце дзіця ў 7 гадоў, і яно з'язджае ад мама-таты ўпершыню, выбірайце летнік, размешчаны не далей, чым у 1-2 гадзінах язды ад дому, рэкамендуюць у **аддзеле грамадскага здароўя Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.** Тады вы зможаце наведваць яго кожны выхадны, а калі нешта пойдзе не так, як меркавалася напачатку, зможаце аператыўна адрэагаваць або забраць яго дадому.

У другі або трэці раз ужо можна падумаць пра больш далёкія паездкі і нават разглядаць адпачынак на моры. Трохтыднёвы адпачынак на ўзбярэжжы, загар і купанні — добрая прафілактыка прастудных захворванняў на працягу навучальнага года. Праўда, лепей загадзя, у басейне, навучыць дзіця плаваць.

### Пазітыўны настрой

Доўгая дарога, нехатнія ўмовы пражывання, неабходнасць падпарадкоўвацца выхавацелям могуць стаць стрэсам для дзіцяці. Таму раскажыце яму пра гэта як пра своеасаблівыя прыгоды. Раскажыце, як самі праходзілі падобныя выпрабаванні. Палата на 4-6 чалавек — гэта жах для дарослага. А для дзіцяці гэта можа быць марай — перашэптвацца па начах, расказваць страшныя гісторыі...

### Што з сабой?

Складзіце спіс рэчаў, якія неабходна пакласці ў сумку (дарэчы, сам спіс таксама можна пакласці ў сумку, каб дзіцяці пасля было лягчэй сабрацца). Яна не павінна быць занадта цяжкай. Лепей, каб адпавядала ўзросту і росту. Асобна ў аўтобус/цягнік трэба ўзяць невялічкую сумку/заплечнік, куды пакласці тое, што патрэбна ў дарозе (вільготныя сурвэткі, ваду, перакус, нешта, здольнае заняць час у дарозе). Абедзве сумкі лепей падпісаць — пазначыць на іх прозвішча дзіцяці.

Складзіце ў сумку тое адзенне, якое любіць ваша дзіця, але не варта класці надта дарагія рэчы. Яны могуць згубіцца, што нярэдка і здараецца. Павінна быць некалькі змен бялізны, куртка, абутак на выпадак дажджу, сухога надвор'я, для пляжу і для корпуса.

У абавязковым парадку кладзіце сонцаахоўны крэм, сродак ад камароў і пару галаўных убораў. Асобна — пуцёўку, пасведчанне аб нараджэнні, медыцынскую даведку (калі дзіця едзе за мяжу, то замежны пашпарт і натарыяльна завераную згоду бацькоў на выезд). З усіх дакументаў лепей зняць копіі і пакласці ў канверт асобна ад арыгіналаў.

Памятайце, што сынуля перад ад'ездам паспрабуе што-небудзь выняць з сумкі, а дачушка — дакласці. Так што перад выхадам можаце пераправерыць усё па спісе.

Дзіцяці з хранічнымі захворваннямі неабходна пакласці лекавыя прэпараты, якія прымаюцца пастаянна або ў час абвастрэнняў. Распішыце на паперцы поўную схему прыёму і папярэдзьце аб гэтай асаблівасці дарослых, якія суправаджаюць дзіця.

Калі ў лагер адпраўляецца 11-13-гадовая дзяўчынка, то яна павінна ведаць, што такое менструацыя і мець з сабой на ўсякі выпадак гігіенічныя сродкі.

Ну, і куды ж без мабільнага тэлефона...

**РЭКАМЕНДАВАНЫ СПІС АДЗЕННЯ І РЭЧАЎ:**

*— майкі, футболкі (4 шт.)*
*— шорты, джынсы*
*— спадніцы, сарафаны*
*— спартыўны касцюм*
*— світар, кофта*
*— дажджавік ці вятроўка*
*— шкарпэткі (5 пар)*
*— бялізна (5 камплектаў)*
*— купальнік, плаўкі (2 шт.)*
*— галаўны ўбор (2 шт.)*
*— шлёпанцы для паходу на пляж ці ў басейн*
*— красоўкі ці кеды для заняткаў спортам, сандалі або туфлі для экскурсій і паўсядзённага нашэння*
*— адзін-два строі для дыскатэк*
*— мыла, мачалка, шампунь, зубная паста і шчотка, расчоска*
*— туалетная папера*
*— пральны парашок або мыла для мыцця адзення*
*— дэзадарант, ласьён, манікюрны набор, пракладкі (для дзяўчынак), брытва (для хлопчыкаў)*
*— ручнік для пляжу*
*— сонцаахоўны крэм, крэм ад камароў і мошак*
*— пусты пакет для бруднай бялізны*
*— блакнот/ручка*
*— ракеткі для тэніса, бадмінтона, мяч (калі вы ведаеце, што гэтага няма ў лагеры).*

Не варта даваць з сабой фотаапараты, электронныя гульні, ноўтбукі, ювелірныя вырабы. Крыху грошай (на экскурсіі, прысмакі і інш.) можна перадаць на захаванне выхавацелю (у падпісаным канверце), калі ваша дзіця не ўмее абыходзіцца з грашамі.

**ЗАБАРОНЕНЫЯ РЭЧЫ:**

*— нажы, нажніцы, любыя колючыя і рэжучыя прадметы*
*— любыя таксічныя рэчывы*
*— цыгарэты, запалкі, запальніцы*
*— петарды, шуціхі*
*— любыя алкагольныя і наркатычныя рэчывы*
*— траўманебяспечнае абсталяванне (скейты, ролікавыя канькі, самакаты)*
*— цацкі, якія страляюць пластмасавымі кулямі*
*— моцнадзейныя лекі (гэта пры неабходнасці высвятляецца з выхавацелямі)*
*— друкаваная, аўдыя-, відэа- і камп'ютарная прадукцыя з прапагандай амаральных паводзін, гвалту, парнаграфіі.*

***Нельга браць з сабой і прывозіць у лагер:***

*— газіраваныя напоі (акрамя мінеральнай вады)*
*— вырабы з крэмам ці напаўняльнікам (торты, піражныя)*
*— чыпсы, жуйкі, малочныя прадукты, мяса, каўбасы, рыбу, птушку, вэнджаніну*
*— супы, пельмені, катлеты, салаты, пірагі*
*— саленні, кансервы, грыбы, прадукты хуткага прыгатавання.*

Калі вам надта неабходна пабалаваць дзіця ў бацькоўскі дзень, няхай ён паесць пры вас, але ні ў якім разе не пакідайце прадукты яму.

**Ганна КУЛАКЕВІЧ**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# НОВЫЯ ВЕДЫ АДПАЧЫНКУ НЕ ПЕРАШКОДА

**У краіне стартавала акцыя «Разумныя канікулы: адпачывай, закаляйся, развівайся». Гэтым летам у аздараўленні дзяцей будзе задзейнічана больш за 5 тысяч летнікаў, якія ахопяць 376,9 тысячы школьнікаў. Пра гэта паведаміў намеснік міністра адукацыі Віктар Якжык на сустрэчы з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры.**

5 лінгвістычных летнікаў, арганізуюцца сумесна з Рэспубліканскім грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА». Наведаюць іх школьнікі не толькі з Беларусі, але і з Расіі, Казахстана, Літвы, Латвіі, Кітая, Ізраіля. У дзяцей будзе магчымасць папоўніць свае веды па нямецкай, французскай, кітайскай і англійскай мовах падчас сустрэч з носьбітамі той ці іншай мовы. Акрамя таго, тут будуць праведзены віктарыны і трэнінгі.

Школьнікаў, якія плануюць працягваць свае навуковыя даследаванні і падчас летняга адпачынку, чакае Рэспубліканская летняя навукова-даследчая школа ў спартыўна-аздараўленчым комплексе «Брыганціна».

Вялікая роля адводзіцца і фарміраванню культуры здаровага ладу жыцця. Працягнецца акцыя «Лета — пара спартыўная». Пашыраецца геаграфія рэспубліканскай акцыі «Футбольныя канікулы», якая праводзіцца сумесна з Асацыяцыяй беларускай федэрацыі футбола ўжо трэці год. Сёлета яна ахопіць Гомельскую, Мінскую, Гродзенскую і Магілёўскую вобласці. Пад кіраўніцтвам трэнераў і вядучых гульцоў нацыянальных каманд пройдуць майстар-класы, таварыскія матчы, а таксама турніры сярод каманд аматараў.

У Мінскай вобласці арганізоўваюцца прышкольныя, ваенна-патрыятычныя, валанцёрскія летнікі і летнікі працы і адпачынку. Усяго іх тут дзейнічае 140. Напрыклад, на базе Бучацінскай сярэдняй школы ў Капыльскім раёне з 10 чэрвеня пачне працу летнік «Орлік», дзе дзеці будуць вырабляць венікі для лазні і атрымліваць за гэта грошы. У 22 раёнах вобласці дзейнічаюць профільныя летнікі для ахвотных вывучаць замежныя мовы. Школы жыцця і адпачынку для праблемных падлеткаў арганізавалі ў 7 ваенна-патрыятычных летніках на базах воінскіх часцей. А ў летніку «Сяброўства», што ў Дзяржынскім раёне, дзеці-інваліды будуць аздараўлівацца сумесна з бацькамі.

**Алена ДРАПКО.**

■ Летнія перспектывы

# Пасля 15 гадоў — толькі профільныя летнікі і лагеры працы і адпачынку

**«Летняя аздараўленчая кампанія пройдзе сёлета ў новым фармаце», — заявіла падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БелТА галоўны спецыяліст аддзела сацыяльна-педагагічнай, фізкультурна-аздараўленчай работы і аховы дзяцінства Міністэрства адукацыі Беларусі Тамара АРЭХАВА.**

Змяненні адбыліся як у нарматыўнай базе, так і ў змястоўным напаўненні работы летнікаў. Па-першае, было ўведзена ўзроставае абмежаванне для «выхаванцаў» летнікаў, арганізаваных на базе стацыянарных аздараўленчых лагераў, санаторна-курортных, аздараўленчых і іншых арганізацый, прыстасаваных пад гэтыя мэты: на такую форму аздараўлення і адпачынку змогуць разлічваць дзеці і падлеткі ва ўзросце ад 6 да 15 гадоў, а таксама дзеці-інваліды і дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў. У так званых профільных летніках узроставае абмежаванне складае ад 6 да 18 гадоў, а ў лагерах працы і адпачынку — ад 14 да 18 гадоў. Пры гэтым узроставае абмежаванне «да 15 гадоў» не распаўсюджваецца на адукацыйна-аздараўленчыя цэнтры і НДЦ «Зубраня», дзе дзейнічае зусім іншы прынцып: галоўная ўмова накіравання ў такі цэнтр — высокія паказчыкі ў навучанні або актыўны ўдзел у грамадскім жыцці.

Па звестках праведзенага маніторынгу запатрабаванасці профільных летнікаў, аздараўленне ў іх пройдуць гэтым летам больш як 31 тысяча навучэнцаў, а ў лагерах працы і адпачынку будуць і адпачываць, і працаваць каля 11 тысяч падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў.

«Кошт пуцёвак у беларускія летнікі вар'іруецца ад 1,8 млн да 4 млн рублёў. Сума платы за адпачынак залежыць ад ведамаснай падпарадкаванасці летніка, матэрыяльна-тэхнічнай базы спектра паслуг, што прапаноўваюцца, і іншых фактараў», — патлумачыла Тамара Арэхава.

Падчас правядзення анлайн-канферэнцыі паступіла прапанова стварыць на інтэрнэт-партале Міністэрства адукацыі спецыяльную старонку, прысвечаную магчымасцям арганізацыі летняга адпачынку. Тамара Арэхава патлумачыла, што Міністэрства адукацыі не мае ў сваім прамым падпарадкаванні аздараўленчых летнікаў. Арганізацыяй аздараўлення дзяцей у летніках займаецца Рэспубліканскі цэнтр па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва сумесна з рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, а таксама арганізацыямі, якія ўтрымліваюць на сваім балансе летнікі.

Прадстаўнік Міністэрства адукацыі пагадзілася, што ў беларускім сегменце інтэрнэту і сапраўды прадстаўлена фрагментарная інфармацыя аб аздараўленчых летніках.

— Менавіта таму ідэя стварэння адзінай старонкі з падрабязнай інфармацыяй аб усіх летніках — з фотаздымкамі, апісаннем, цэнамі на пуцёўкі, колькасцю месцаў — вельмі запатрабаваная і неабходная. Міністэрства адукацыі абавязкова разгледзіць гэту прапанову сумесна з Рэспубліканскім цэнтрам па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні і рэгіёнамі, — паабяцала Тамара Арэхава.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Асаблівасці аднаго прадукту

# ЯКАСНАЯ ПАСТА — НЕ ПРАБЛЕМА ДЛЯ ФІГУРЫ



**Каб атрымаць макарону або, правільней сказаць пасту найвышэйшай якасці, неабходна выкарыстоўваць пшаніцу цвёрдых гатункаў, прычым зерне павінна дасканала адбірацца. Вызначальным элементам з'яўляецца колькасць клейкавіны, піша адно з замежных выданняў.**

Калі лічыць пасту простай крыніцай вугляводаў, то нельга забываць, што менавіта колькасць бялку вызначае спажыўныя і арганалептычныя вартасці. Высокая колькасць клейкавіны ў бялковым складніку гарантуе захаванне эластычнасці і добрай кансістэнцыі падчас варкі і зводзіць да мінімуму страты крухмалу і спажыўных рэчываў.

Добрая паста не прыводзіць да павелічэння вагі. Але паколькі яна з'яўляецца крыніцай вугляводаў, то трэба ўлічваць тыя калорыі, якія яна дае арганізму. Наогул вугляводы — самая важная крыніца з макраэлементаў харчавання. Прыкладна 55-60 працэнтаў неабходных калорый павінна паступаць за іх кошт. Нягледзячы на тое, што паста забяспечвае арганізм значнай колькасцю энергіі, яна ў меншай ступені прыводзіць да лішняй вагі, чым бялкі і тлушчы. Прычына ў тым, што вугляводы хутка пераатраўліваюцца, і пры ўмове нізкай колькасці іншых макраэлементаў харчавання атрыманыя ад вугляводаў калорыі лёгка рассейваюцца ў выглядзе цеплыні, а не назапашваюцца.

Праўда, не ўсе вугляводы аднолькавыя. Простыя і рафінаваныя цукры, якія змяшчаюцца ў салодкіх стравах, шкодныя, таму што пры залішнім ужыванні яны спрыяюць хуткаму назапашванню энергіі. А вось складаныя — крухмал (асноўны інгрэдыент пасты) — з'яўляюцца найлепшымі, паколькі маюць нізкі глікемічны індэкс. Такія прадукты забяспечваюць працяглае пачуццё сытасці, меншую вагу, меншую рызыку захварэць на дыябет. Яшчэ лепш, калі разам з вугляводамі ўжываецца шмат клятчаткі. Яна спрыяе рабоце кішэчніка, а пэўная колькасць неператраўленага крухмалу дапамагае росту спрыяльнай мікрафлоры стрававальнага тракту.

Існуюць віды макароны з высокай колькасцю клятчаткі і нізкім глікемічным індэксам. Яны зніжаюць глікемічны пік і забяспечваюць добрае пачуццё сытасці. Такія віды пасты могуць дастаўляць менш за 300 ккал на 100 г супраць 350 ккал на 100 г у звычайнай макароне. Паста Kamut зараз у вялікай модзе, але гэта не разнавіднасць зерня, а назва маркі для продажу асаблівага віду зерня — Khorasan. Яго вырошчваюць выключна біялагічнымі метадамі згодна з самымі высокімі стандартамі якасці. У параўнанні з іншымі гатункамі яно змяшчае больш бялку і некаторых соляў селену, цынку і магнію. Яно лепей засвойваецца, але хворыя на цэліякію павінны ставіцца да гэтага гатунку з асцярожнасцю з-за высокай колькасці клейкавіны. Той, хто пакутуе ад падобнага парушэння стрававання, можа ўжываць пасту без клейкавіны або вырабы на аснове рысавай ці кукурузнай мукі.

Варта памятаць, што неразвараная паста ператраўліваецца лепш, чым развараная, таму што працэс стрававання пачынаецца ў роце падчас перажадоўвання. У сліне прысутнічае энзім птыялін, які спрыяе лепшаму ператраўліванню крухмалаў пасты. Калі паста не лішне развараная, то мы вымушаны даўжэй яе перажаоўваць, а пасля яна лепей засвойваецца.

**Ганна КУЛАКЕВІЧ**

# «ЗАРНІЦА»: старая гульня на новы лад

**Пераадоленне перашкод, уменні паставіць палатку, аказаць першую медыцынскую дапамогу і зарыентавацца пры дапамозе компаса на мясцовасці... Спартыўна-патрыятычны конкурс «Зарніцы» прайшоў у Мінску на базе Ваеннай акадэміі.**

**...Некалькі хвілін на пастраенне, праверка гатоўнасці. Каманды па чарзе разбягаюцца па лесе — сапраўдная гульня пачалася. Заключны і самы цікавы камбінаваны этап спаборніцтва — гульня на мясцовасці «Абарончыя рубяжы» — захапіла ўсіх удзельнікаў спаборніцтва. Сёлета ў «Зарніцы» прымаюць удзел падлеткі 12-13 гадоў. Праграма гульні насычаная і цікавая. Сем камандаў сталічных школьнікаў на працягу пяці дзён вытрымлівалі розныя выпрабаванні, напрыклад, не толькі ўдзельнічалі ў спартыўных спаборніцтвах, а таксама афармілі баявы лісток, успомнілі старонкі гісторыі, песні.**

**«Зарніцай» захапляліся ўсе піянеры Савецкага Саюза. Ваенна-спартыўная гульня з'яўлялася часткай сістэмы пачатковай ваеннай падрыхтоўкі школьнікаў. Сённяшнія школьнікі не толькі паспяхова авалодваюць гэтымі навыкамі, але і выпрацоўваюць навыкі дзеяння ў экстрэмальных сітуацыях, рыхтуюцца да службы ў арміі.**

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**







■ Для жанчын 50+

# НІЯКІХ НЕПРЫЕМНЫХ АДЧУВАННЯЎ!

**Такі пераходны стан, як клімакс, у многіх жанчын суправаджаецца самымі рознымі непрыемнымі сімптомамі. Гэта клімактэрычны сіндром, калі па прычыне дэфіцыту эстрагенаў з'яўляюцца розныя паталагічныя станы. Нейравегетатыўныя, урагенітальныя парушэнні, хваробы сардэчна-сасудзістай сістэмы, астэапароз; прылівы гарачкі, дрыжыкі, патлівасць, артэрыяльная гіпертэнзія, раздражнёнасць, апатыя, парушэнне сну, пагаршэнне памяці, дэпрэсія, страта цікавасці да любімага мужа і інш.**

— На жаль, пры з'яўленні падобных сімптомаў жанчыны пераходнага ўзросту даволі рэдка звяртаюцца да гінеколага, а становяцца пацыенткамі іншых медыцынскіх спецыялістаў, — кажа **акушэр-гінеколаг 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Аляксандра СТАНКЕВІЧ.** — Між тым існуе мноства спосабаў, дзякуючы якім можна працягнуць маладосць душы і цела. Жанчына павінна разумець, што клімакс — пачатак новага этапу жыцця. Наспеў час адмовіцца ад курэння, ужывання алкаголю. Пастаянны рух і збалансаванае харчаванне дапамогуць прафілактыцы астэапарозу, захворванняў сэрца і сасудаў. У ідэале гарманальная тэрапія, якую дапаможа падабраць ваш гінеколаг, — дадатак да здаровага ладу жыцця. Для захавання высокай якасці жыцця патрабуецца і жыццесцвярджальны настрой...

### Харчаванне

✓Алкаголь і вострая ежа ўзмацняюць прылівы, таму іх лепей выдаліць з рацыёну.

✓З узростам, асабліва ў жанчын пасля наступлення менапаўзы, косці пачынаюць страчваць кальцый, таму лёгка ламаюцца. Жанчына пераходнага ўзросту павінна выдаліць з рацыёну соль і салёныя прадукты (саленні і ўсе прадукты, якія змяшчаюць багата солі — сасіскі, каўбасы і г.д.), каб папярэдзіць развіццё цяжкага астэапарозу. Справа ў тым, што ў састаў солі ўваходзіць натрый — антаганіст кальцыю. Лішак натрыю ў арганізме прыводзіць да вывядзення кальцыю з касцей у кроў.

✓Тлустае, салодкае і мучное прыводзяць да атлусцення. А атлусценне для жанчыны пасля 50 гадоў небяспечна тым, што павялічвае рызыку развіцця раку малочнай залозы.

**Ужывайце:**

**1.** Малочныя прадукты (тварог, ёгурт). Я павышаюць узровень кальцыю і спрыяюць умацаванню касцей.

**2.** Міндаль — крыніца кальцыю і амега-3 поліненасычаных тлустых кіслот, якія абараняюць ад інфаркту, інсульту, зніжаюць рызыку развіцця раку.

**3.** Насенне льну і пажытнік. Яны змяшчаюць фітаэстрагены — раслінныя аналагі жаночых палавых гармонаў. Фітаэстрагены дапамогуць скарэктаваць эстрагенную недастатковасць.

**4.** Селядзец, скумбрыя, сардзіны — крыніца амега-3 тлустых кіслот, якія выводзяць з арганізма халестэрын і папярэджваюць развіццё сардэчна-сасудзістых захворванняў.

**5.** У рацыёне харчавання абавязкова павінны быць бабовыя, зяленіва, гародніна і садавіна.

### Прыгажосць

Вельмі важна правільна даглядаць скуру. Неабходна рэгулярна чысціць скуру мяккім малачком або ачышчальным крэмам. З-за таго, што скура любога тыпу робіцца сухой, ёй патрэбна значна больш увільгатнення, чым раней. Абавязкова прымяняць не толькі дзённы, але і інтэнсіўны начны крэм. Спалучаць іх разам з гелямі, эсэнцыямі і сывараткамі з увільгатняльным дзеяннем. У арганізме да гэтага ўзросту запавольваюцца абменныя працэсы, таму неабходна паскорыць спажыўныя працэсы з дапамогай эмульсій, сываратак, масак, геляў, якія будуць жывіць, увільгатняць і рэгенераваць скуру. Варта выкарыстоўваць сродкі «антыэйдж» — ліфтынг, маскі, пілінг, мезатэрапію і іншыя сучасныя сродкі па барацьбе з узроставымі змяненнямі.

Неабходна прымяняць актыўныя рэчывы, якія абараняюць скуру ад ультрафіялету.

### Фізічная актыўнасць

Не ад пліты да пральнай машыны, а прагулкі на свежым паветры перад сном, заняткі ёгай, наведванне басейна. Плюс элементарная фізкультура, хаця б перад тэлевізарам. Галоўнае — рэгулярна.

Абавязкова патрэбен паўнацэнны адпачынак, і ў першую чаргу — сон, галоўны сябар у захаванні прыгажосці і добрага настрою.

Рэгулярна наведвайце свайго ўрача.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Факт

# ЗА ГОД — ТРЫ НОВЫЯ ГАТУНКІ ШАМПАНСКАГА

**Мінскі завод пеністых він прадаў 16—24 красавіка інвестарам 75 296 акцый па балансавым кошце 285 650 рублёў за акцыю. Такім чынам, акцыянернае таварыства атрымала на развіццё 21 508 302 400 рублёў. Цяпер 17,5% устаўнога фонду належыць юрыдычным асобам, 7,5% — фізічным. Астатняе засталося ва ўласнасці дзяржавы.**

— Адначасова з даходамі грошы ад народнага IPO ствараюць фінансавы падмурак для мадэрнізацыі да 2015 года, — кажа генеральны дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі завод пеністых він» Леанід КРАЎЧУК. — План мадэрнізацыі прадугледжвае замену фізічна і маральна састарэлага абсталявання, што дазволіць скараціць працазатраты, расход паліўна-энергетычных рэсурсаў, павялічыць тэрміны захоўвання і рэалізацыі прадукцыі, скараціць затраты па імпарце. У бліжэйшай перспектыве мы маем намер надаць асаблівую ўвагу і маркетынгу. Ужо зараз прапануем і зніжкі, і спецыяльныя дэгустацыі праводзім, і набываем для гандлёвых прадпрыемстваў адпаведнае абсталяванне...

Дарэчы, летась прадпрыемства выпусціла новы гатунак пеністага віна «Bonne Chance» («Бон Шанс») з іспанскіх вінаматэрыялаў. У сакавіку гэтага года было выпушчана пеністае віно «Grand de Luxe» («Гранд дэ Люкс») з класічных французскіх вінаматэрыялаў. Гэтае віно займае верхнюю нішу па кошце, адносіцца да вытрыманых пеністых він (не менш за 6 месяцаў вытрымкі) і выпускаецца ў двух гатунках — «брут» і «паўсалодкае». У красавіку ў продажы з'явілася шампанскае «Рандэву» — чырвонае, створанае з купажу іспанскіх вінаматэрыялаў. Літаральна да канца года ўся прадукцыя завода пеністых він будзе выпускацца з коркавымі пробкамі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Простыя рэчы Сяргея Рублеўскага



# ШКІПІНАР

**Калі б у касмічнай цемры далі што-небудзь панюхаць, каб згадаць белы свет, дык спазнаў бы яго толькі разам са згадкай маленства. Адтуль усе пахі першасныя, памятныя, усе астатнія — вытворныя, нажытыя і таму выпадковыя.**

Я ўнюхаў бы гэты свет у касмічным прадонні па шкіпінары. І згадаў бы марозны вечар. Што ён марозны, з іскрыстым снегам, можна было здагадацца толькі па шыбах, спрэс зацягнутых карункавымі, ледзь кранутымі ледзяным блакітам узорамі. У хаце гула траскучым полымем грубка, і пад тоўстай важкай коўдрай было млосна ад цёплага духу. Ад расчыненай грубкі даходзілі цёплыя павевы, але яны былі залішнімі: маё абвялае цельца і само сыходзіла гарачынёй. А як было не коўзацца расхрыстанаму, высалапіўшы язык, па ледзь прыцярушаным і таму яшчэ больш слізкім лёдзе на сажалцы! Ды яшчэ цэлы дзянёк, пакуль з пагрозамі адлупцаваць не паклікалі дадому.

Але што тая лупцоўка, калі цяпер даводзіцца дзянькамі нерухома ляжаць пад гнятлівым покрывам, нібы скошанай сцябліне. Асабліва цяжка, крыўдна і горка, усё адно як праглынуўшы сто пігулак, ляжаць якраз удзень, калі з вуліцы чутны вясёлыя галасы сяброў-гарэзнікаў. Яны ўсё яшчэ коўзаюцца!..

А ты ляжыш і кранаеш раз-пораз прыкрую павязку на лбе са складзенай у колькі столак матчынай хусткі. І крадком дастаеш з-пад яе тонкія скрылькі сырой бульбіны, каб падзівіцца, як яны, колькі хвілін таму вільготна-халаднаватыя, пацямнелі і пакарабаціліся па краях, нібы іх паклалі на вуголле, што патыхае жарам. Але яшчэ і гэты скрылёк прыглушыць, уцягне ў сябе маю прастудную гарачку — хуценька падторкваю яго пад хустку, бо чую крокі заюшанай па гаспадарцы маці.

Яна на хаду хукае на закалелыя на марозе рукі, потым садзіцца на ўслончык каля самай грубкі і, шырока растапырыўшы, як птушка пёры, пальцы, грэе іх у гарачым паветры. Я ўжо добра ведаю, для чаго.

Неўзабаве матуля бярэ са стала пузелістую бутэлечку з празрыста-сонечнай вадкасцю, маленькі слоічак са свіным тлушчам і садзіцца каля мяне на край ложка. Пакуль яна кладзе на далонь драбок тлушчу і падлівае да яго крышку шкіпінару, я ўжо пасяваю падрыхтавацца і ляжу напагатоўку — ніцма, з падкасанай да самай шыі сподняй кашулькай. Спіна аголена, можна націраць! Маці спрытна, нібы са сподачка, налівае са сваёй далоні націранне на мой пазваночнік і пачынае спачатку хуценька, каб шкіпінар не пацёк на бакі, шараваць маю спіну. Шурпатая маміна далонь ходзіць па мне, як цяжкі камень жорнаў, але я толькі колькі імгненняў звяртаю ўвагу на гэтую прыкрасць.

Спіну лепш, чым якая коўдра, пачынала ахінаць гаючая цеплыня, а нос напаўняць казытлівы пах шкіпінару. І міжволі заплюшчваюцца вочы, бо з заплюшчанымі вачыма куды больш выразна згадваліся відарысы меднастволага светлага бору, у якім хадзіў я з бацькам па грыбы і перанюхаў з добры дзясятак набірак, напоўненых густой бурштынавай жывіцай. Так падабалася, што нюхаў бы яшчэ і яшчэ, калі б не прыспешваў, раз-пораз гукаючы, бацька. Толькі аднойчы, добра прастудзіўшыся, я зразумеў, што жывіца пахла шкіпінарам.

Маленства праходзіць, як лёгкая ненабірушчая хвароба...

Напэўна, чалавецтва пачало вынаходзіць парфуму, каб Ён і Яна хоць у сваім п'янючым забыцці вастрэй згадалі месца свайго выгнання — рай. Якія хітрыкі! Якая наўмысная няўцямнасць! Нібыта дзякуючы галавакружнапрыемным пахам можна згадаць апекаванне Бога ў кутку кветкавых купін ды працяглыя вечаровыя павучальныя размовы з Ім.

Няўжо я настолькі састарэў, што лепшай парфумай для мяне стаў шкіпінар?

Калі так, дык шкадую, што мая парфума, мае лекі ад старасці цяпер, у адрозненне ад пары маленства, не прадаюцца ў аптэках — я не знайшоў. Замест іх — тэрпенцінавы алей: бутэлечка куды меншая (усё адно як хто пашкадаваў мне згадак маленства), з непразрыстага шкла



Люблю бываць у майстэрнях мастакоў — здавён да душы жывапіс, а яшчэ тое, што лакі ды некаторыя фарбы ў іх — на шкіпінары.

(хоць навошта яно, празрыстае, калі алей не мае бурштынавай сонечнасці), з вельмі блізкім да ранейшага, але ўсё ж не настолькі пераканаўчым, які нагадваў жывіцу, пахам...

Але я не скарджуся на час і здавальняюся тым, што ёсць. Раз за разам купляю ў аптэцы цяперашні заменнік шкіпінару і стаўлю бутэлечку на сваім пісьмовым стале. Сяду пісаць, адкрыю, панюхаю, удыхну глыбока водарнае паветра — і здаецца, што ў мяне яшчэ некрануты абсяг часу — на дзесяць, а то і болей, гадоў. А то і наогул здасца, што час нязводны, як у маленстве.

А тады іду ў пакой да мамы і на ейную далоньку, як калісьці зробленую ямачкай, тонкім цурком наліваю шкіпінарную вадкасць. Яна з задавальненнем націрае ёю рукі, нюхае — і твар яе азарае натхняльная праясненасць.

Далонь у маёй 89-гадовай мамы стала маленькай, сухенькай, зграбнай, а скура на ёй ад гарадскога жыцця — зусім нешурпатай, амаль што далікатнай, як у дзявоцтве. Я, мусіць, упудзіўся б ад нечаканасці, калі б матуля ўзялася цяпер націраць мне спіну.

Яна падстаўляе далоньку, каб я капнуў «шкіпінару» яшчэ грамульку — хочацца ўволю нанюхацца. Якое пры гэтым яна згадвае маленства — сваё ці маё, я не ведаю.

■ Сітуацыя

# КУЛЬТПАХОД ДЛЯ ІНВАЛІДАЎ

**У Беларусі пражывае каля паўмільёна людзей, якія «маюць групу» па інваліднасці. Дзясяткі тысяч з іх прыкаваны да каляскі або пакутуюць ад сур'ёзных праблем са зрокам, да поўнай слепаты ўключна. Аднак яны не павінны з-за сваёй нямогласці выпадаць з грамадскага жыцця, не маючы ў тым ліку магчымасці падарожнічаць. Праблемы экскурсійнага абслугоўвання людзей з абмежаванымі магчымасцямі абмяркоўваліся на пасяджэнні «круглага стала» ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры.**

У Заходняй Еўропе праблема безбар'ернага асяроддзя не стаіць так востра. Напрыклад, атэль у некаторых краінах не стане чатырохзоркавым, пакуль санвузел не будзе прыстасаваны для інвалідаў.

— Няма таго чалавека, які б сказаў, што мае цалкам неабмежаваныя фізічныя магчымасці. Проста камусьці пашанцавала яшчэ менш. Шмат у чым пагардлівае стаўленне да інвалідаў абумоўлена архаічным уяўленнем, што яны людзі асаблівыя, і гэта аўтаматычна выводзіць іх «за дужкі», — лічыць каардынатар Офіса па правах людзей з інваліднасцю Сяргей Драздоўскі. — Свабодны доступ такіх людзей у розныя гарадскія будынкі даўно стаў візітнай карткай Заходняй Еўропы. Уся праблема заключаецца толькі ў арганізацыі адпаведнай інфраструктуры, чаго яўна не хапае ў нас.

Сапраўды, мала ўсталяваць зручны пандус побач з уваходам у музей. А калі чалавек не бачыць, то як ён здолее зірнуць на прадметы экспазіцыі? На сёлетнім «Фэсце экскурсаводаў» былі арганізаваны дзве вандроўкі спецыяльна для інвалідаў.

— Аднак меркаваць, што ў Мінску існуе паўнавартасна развітая экскурсійная сістэма, пакуль нельга з-за таго, што культпаходы не прыстасаваны да запытаў людзей з абмежаванымі магчымасцямі, — мяркуе прадстаўнік арганізацыйнага камітэта «Фэста экскурсаводаў-2013» Павел КАРАЛЁЎ. — І таму ў гэтым кірунку трэба зрабіць яшчэ вельмі шмат. Першая спроба, якая была здзейснена на нядаўнім «Фэсце экскурсаводаў», прайшла на «выдатна». І мы спадзяёмся, што з цягам часу экскурсіі стануць інтэграванымі.

Першая такая эксперыментальная экскурсія адбылася 21 красавіка на мінскай плошчы Свабоды. Чатыром невідушчым быў усебакова прадэманстраваны найтанчэйшай працы барэльеф цэнтральнага фасада сталічнай ратушы, які выканаў лепшчык па гіпсе Ігар Якавенка.

— Цяпер кожны невідушчы чалавек зможа адчуць сваімі пальцамі фасад гістарычнага помніка і ўявіць сабе, як ён выглядае ў рэальнасці, — гаворыць арганізатар праекта «Дакрананне да Мінска» Людміла СКРАДАЛЬ. — Тры нашы валанцёры за месяц зрабілі дакладны макет будынка ратушы. Але на дасягнутым спыняцца не будзем. У нашых планах — зрабіць барэльефы і макеты буйнейшых помнікаў архітэктуры ўсёй Беларусі. Былі б толькі грошы і час...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■ Недзіцячыя гульні

# Змеі ўзвіліся высока

## ДЛЯ МНОГІХ ЛЁТЧЫКАЎ ШЛЯХ У НЕБА ПАЧЫНАЎСЯ З ГЭТАГА ЗАХАПЛЕННЯ

**Кіраўнік авіямадэльнага гуртка з Гомельскага гарадскога цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Мікалай Лысы літаральна на пальцах паказвае і расказвае, як зрабіць самы просты лятальны апарат:**

— За кошт вугла атакі ствараецца пад'ёмная сіла паветранага змея. Ніткі аднолькавай даўжыні трэба правільна замацаваць — у



адпаведнасці з канфігурацыяй «хвастатага». Змея пажадана запускаць на адкрытым месцы — каб не было турбулентных патокаў.

І пасля гэтага тлумачэння вы яшчэ будзеце думаць, што запусканне змея — дзіцячыя гульні? Між іншым, для многіх лётчыкаў шлях у неба пачынаўся з гэтага захаплення, якое сёння актыўна выцясняецца больш сучаснымі гульнямі — на камп'ютары.

Можа, для таго, каб адрадзіць папулярную ў мінулым стагоддзі гульню, у Гомелі і прайшоў фестываль паветраных змеяў. Але арганізатары бачаць і іншыя задачы. Дырэктар гомельскага гарадскога цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Ігар Бейзераў лічыць, што сёння вельмі важна акцэнтаваць увагу на ўзаемадзеянні дзяцей са сваімі бацькамі. Менавіта таму адна з намінацый фестывалю — «сямейны экіпаж».

Ветэран гомельскага авіямадэлізму, былы настаўнік тэхнічнай працы Міхаіл Яўгенавіч Шумскі запускае змеяў... з 1952 года! Расказвае, што 60 гадоў таму яго самога вучыла рабіць мадэлі ў клубе імя Леніна авіямадэліст Марыя Мікалаеўна Зайцава:

— З аднаго боку, нескладаныя апараты, і ў той жа час гэтая справа вельмі захапляе. Хоць зараз мяне асабіста больш цікавяць радыёкіраваныя мадэлі. Я сам быў доўгі час кіраўніком авія- і ракетамадэльнага гуртка. Мае авіямадэлісты станавіліся чэмпіёнамі рэспублікі. А ракетамадэлісты заваёўвалі першыя месцы на саюзных чэмпіянатах. Цяпер значна менш дзяцей займаецца ў авіямадэльных гуртках, хоць менавіта гэтая справа можа шмат чаму навучыць. Калі ў юным узросце падлетак навучыцца рабіць сваімі рукамі нешта карыснае, гэта яму абавязкова спатрэбіцца потым. Ды і асновы метэаралогіі адначасова спасцігаюцца — трэба ж ведаць, калі і дзе запускаць змея. Галоўнае — пра тэхніку бяспекі памятаць: нельга запускаць апараты ля высакавольтных правадоў.

На пляцоўцы недалёка ад Сожа каля 100 удзельнікаў прадэманстравалі, на што здольныя іх лятальныя апараты. Самыя прыгожыя, напэўна, не былі зроблены сваімі рукамі, але ж увагу дзятвы яны прыцягвалі сваёй афарбоўкай. Прафесіянальныя авіямадэлісты ацэньвалі не толькі эстэтычнае афармленне, але і аэрадынамічныя якасці мадэляў. Лепшымі ў намінацыі «Сямейны экіпаж» сталі Аліна Кухарэнка і яе бацька Алег. У намінацыі «Экіпаж» перамаглі Дзмітрый Лупкоў і Арцём Платонаў з 26-й гомельскай школы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара**



■ Крымінал, здарэнні

## БАНКАЎСКІЯ КАРТКІ ФАЛЬШЫВЫЯ — ГРОШЫ САПРАЎДНЫЯ

**На працягу некалькіх дзён у снежні мінулага года невядомыя, выкарыстоўваючы падробленыя банкаўскія карткі, знялі з банкамаў у абласным цэнтры каля 90 мільёнаў рублёў, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Гродзенскія аператыўнікі раскрылі гэты крадзеж сумесна з калегамі з Гомеля. Паводле інфармацыі начальніка аддзела па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій УУС Гродзенскага аблвыканкама, падпалкоўніка міліцыі Сяргея Чарняка, устаноўлены асобы падазроных — гэта двое жыхароў Магілёва 1984 і 1988 г.н. Аферысты карысталіся падробленымі карткамі банкаў Расіі і Казахстана, знімаючы грошы з рэальных рахункаў фізічных асоб гэтых краін. Акрамя Гродна, зламыснікі таксама арудавалі ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях, дзе таксама ўчынялі крадзяжы тым жа спосабам. Цяпер высвятляецца, якім чынам да іх трапілі падробленыя банкаўскія карткі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ВЕТЛІВЫ РАЗБОЙНІК

**Малады чалавек зайшоў у невялічкую краму на канцавым прыпынку грамадскага транспарту ў Гомелі і папрасіў прадаць яму бутэльку піва. Неабходнай маркі ў асартыменце не было, і ён выйшаў.**

Прадавец ужо збіралася зачыняць памяшканне, калі хлопец зноў зазірнуў у краму. Нечакана пакупнік прыставіў да яе жывата прадмет, падобны на пісталет, і спакойна прамовіў: «Касу». Жанчына гучна закрычала. Хлопец вельмі збянтэжыўся, адступіў да дзвярэй і ціха прашаптаў: «Прабачце». Пасля чаго выскачыў на вуліцу і знік. Гандлярка ж патэлефанавала на лінію «102». Міліцыянеры сталі адпрацоўваць магчымыя версіі. У здзяйсненні злачынства падазраваўся малады чалавек з неславянскай знешнасцю. У поле зроку трапіў студэнт адной з гомельскіх ВНУ, якога затрымалі праз пару гадзін.

22-гадовы хлопец прыехаў у Беларусь з Туркменістана з мэтай атрымання вышэйшай адукацыі. Па папярэдняй інфармацыі, ён адважыўся на гэты ўчынак для таго, каб вярнуць даўгі. Як паведаміў начальнік аддзела ўнутраных спраў адміністрацыі Савецкага раёна Аляксандр Слесарэнка, па факце здзяйснення разбойнага нападу заведзена крымінальная справа. Санкцыі артыкула прадугледжваюць пакаранне ад 3 да 10 гадоў пазбаўлення волі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

